Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 176 (5009)
ЖНІЎНЯ
10
ПЯТНІЦА
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ У НУМАРЫ

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б—АБ ПАРУШЭННІ СОВЕЦКАЙ ПАЛІТЫКІ ЦЭН У НЕКАТОРЫХ КААПЕРАТЫЎНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ.

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР—АБ УБОРЦЫ І ПЕРШАПАЧАТКОВАЙ АПРАЦОЎЦЫ ІЛЬНУ.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—УБРАЦЬ І АПРАЦАВАЦЬ ЛЁН БЕЗ СТРАТ; ЖАР—КАНФЛІКТ ФАШЫСЦКАЙ ІТАЛІІ З ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІЯЙ; ПЯТРУСЬ БРОЎКА—ДЗІЦЯЧАЯ СКРЫПКА; АЛ. ДУДАР—ШЧАСЦЕ МАЙГО ПАКАЛЕННЯ.

МЕСЯЧНІК АБМЕНУ ВОПЫТАМ КАЛГАСНЫХ І БРЫГАДНЫХ ПАРТОРГАЎ; М. ВАРАБ'ЁЎ—ЯК МЫ АРГАНІЗАВАЛІ РАБОТУ НА ЎБОРАЧНАЙ; ЯКАЎЛЕЎ—ЯК Я ВЫВУЧАЮ І ВЫХОЎВАЮ АКТЫЎ.

АГЛЯД ДРУКУ—ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА ЖЫВОГА ЧАЛАВЕКА.

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ.

ЗА РУБЯЖОМ: ПАЎСТАНЦКІ РУХ У МАНЧЖУРЫІ РАСЦІ; ЛІТВА ПРЫМЕ ЎДЗЕЛ У РАСПРАЦОЎЦЫ УСХОДНЯГА ПАКТА; СОВЕЦКІЯ ЛЁТЧЫКІ Ў РЫМЕ І ПАРЫЖЫ.

АСНОЎНУЮ МАСУ КАЛГАСНІЦ—НА УБОРКУ ІЛЬНУ!

Пакончыць з кулацкім сабатажам уборкі ільну ў Прапойскім, Ельскім, Клімавіцкім, Бабруйскім, Чачэрскім, Петрыкаўскім, Крычаўскім, Жыткавіцкім, Рагачоўскім, Полацкім, Уздзенскім, Нараўлянскім, Чэрвеньскім, Быхаўскім, Заслаўскім і Кармянскім раёнах

УБРАЦЬ І АПРАЦАВАЦЬ ЛЁН БЕЗ СТРАТ

Наша краіна мае самыя вялікія пасевы ільну і адыгрывае буйнейшую ролю ў сусветнай вытворчасці ільнаваўлакна. Калгаснае і саўгаснае будаўніцтва з'явілася асноўным шляхам у вырашэнні праблемы тэхнічных культур. Іменна дзякуючы гэтаму ўдалося ў кароткі тэрмін ажывіць ільнаводства, значна павысіць яго дарэвалюцыйны ўзровень, парабудаваць тэхніку першапачатковай апрацоўкі ільну.

Усё больш і больш узрастае запатрабаванне ў ільняным валакне, а гэта ў год павышаюцца запатрабаванні к ільнавытвараючым раёнам і кожная восень з'яўляецца своеасаблівым агляднам. Што зроблена за год, якія поспехі ў павышэнні ўраджайнасці, на якія сыравінныя рэсурсы можа разлічваць наша прамысловасць? Партыйныя і совецкія арганізацыі ільнавытвараючых раёнаў трымаюць адказ перад усёй краінай за ўборку і апрацоўку ільну без страт, за добрую сыравіну для прамысловасці і экспарту.

Уборка ільну ўжо пачалася. У гэтым годзе яна супала з уборкай жыта і другіх зернавых культур. І ПЕРШАЙ УМОВАЙ ПОСПЕХУ ЎБОРКІ ІЛЬНУ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ПРАВІЛЬНАЕ СПАЛУЧЭННЕ ЦЕРАБЛЕННЯ ІЛЬНУ З УБОРКАЙ ЖЫТА І ДРУГІХ ЗЕРНАВЫХ КУЛЬТУР. Толькі план, звязваючы ў адзіны вузел усе асеннія работы, дапаможа правільна арганізаваць справу і ўхіліцца страт. МІЖ ТЫМ, З РАЁНАЎ ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦІ, ГОРКАЎСКАГА КРАЯ, БЕЛАРУСІ, УСЁ ПАЧАШЧАЮЦЦА СІГНАЛЫ АБ ТЫМ, ШТО ЛЁН ПЕРАСТОЙВАЕ, ГУБЛЯЕ СВАЕ КАШТОЎНЫЯ ЯКАСЦІ. У БЕЛАРУСІ К ПЕРШЫМ ЧЫСЛАМ ЖНІЎНЯ ВЫСПЕЛА БОЛЬШ ПАЛОВЫ ЎСЯГО ІЛЬНЯНОГА КЛІНУ, АЛЕ НА 1 ЖНІЎНЯ ВЫЦЕРАБЛЕНА БЫЛО ЎСЯГО 30 ПРОЦ. УРАДЖАЮ. У Заходняй вобласці выспеў амаль увесь лён, за выключэннем пасеянага ў самыя позніе тэрміны, выцераблена-ж усяго 15 проц. пасеваў. Асноўнай прычынай такога спазнення з'яўляецца тое, што некаторыя мясцовыя арганізацыі замяшаліся і не змаглі дабіцца аднячасовай уборкі жыта, пшаніцы, аўса. КІРАЎНІКІ РАДУ РАЁНАЎ І КАЛГАСАЎ НІЧОГА ЛЕПШАГА НЕ МАГЛІ ПРЫДУМАЦЬ, ЯК ЗНЯЦЬ З ІЛЬНЯНЫХ ПАЛЕЎ І БЕЗ ТАГО НЯЗНАЧНУЮ КОЛЬКАСЦЬ КАЛГАСНІКАЎ, ПРАЦАВАЎШЫХ ТАМ, І ПЕРАКІНУЦЬ ІХ НА ЎБОРКУ ЗЕРНАВЫХ.

ТАКАЯ БЕЗАДКАЗНАСЦЬ НЕЦЯРПІМА. Нельга добраахвотна ісці на вялікія страты ільну з-за неарганізаванасці і расхлябанасці. Трэба папярэдзіць партыйныя арганізацыі і памітددзелы ільнавытвараючых раёнаў аб асобай адказнасці за уборку і апрацоўку ільну. Варта толькі глянуць, як праходзяць першыя дні ўборкі, каб пераканацца ў тым, што лён не з'яўляецца перашкодай ва ўборцы зернавых і наадварот. Уся справа ў падрыхтоўцы, продуманасці работ, правільным размеркаванні наўных сіл і сродкаў вытворчасці.

Перш за ўсё аб машынах. У нас ёсць два тыпы ільнаўборачных машын — ільнацерабілка «Комсамолец» і шыроказахопная «ВНІІЛ». Першая з іх пасля некаторых канструктыўных змен упаўне задавальняе патрабаванні высокакласнай уборкі. Шыроказахопная-ж церабілка адрозніваецца, акрамя гэтага, высокай прадукцыйнасцю. У калгасах Сенненскага і Ушацкага раёнаў Беларусі, у першыя-ж дні ўборкі, шыроказахопная церабілка за 8 гадзін работы ўбірае 5 га. Калі ўлічыць не толькі працайкі працэс церабілання ільну, то становіцца зразумелым, якое мае значэнне правільнае спарыстанне ільнаўборачных машын. Аднак, вельмі часта намаганні мясцовых работнікаў накіраваны ў другі бок. Пад усякімі прычынамі машыны знімаюцца з уборкі, значная частка іх працуе дрэнна, а ў некаторых мясцах ільнацерабілкі проста ігнаруюцца.

У Вязынскай МТС, Заходняй вобласці, з 100 «Комсамолец», 50 бездзейнічаюць. У Гжацкай МТС з 84 церабілак, працуюць толькі 40, у Суражкім раёне Беларусі 52 церабілкі убралі ўсяго дзесятак гектараў ільну, у Чаускім раёне 23 церабілкі выцераблілі 1,7 га. Такіх фактаў мноства.

Прычына ў тым, што кіраўнікі многіх МТС і раённых арганізацый надзвычай безклапотна падышлі да скарыстання машын. Кадры ільнацерабільшчыкаў падрыхтаваны дрэнна, няма палявога бягучага рамонту і правільнага падбору ўчасткаў. Бо ільнацерабілка, як і камбайн, патрабуе чыстага роўнага ўчастка, сістэматычнага догляду, уважлівага агляду.

Урад абавязаў праверыць гатоўнасць МТС да машыннага церабілання. Старшыні раённых выканкомаў, дырэктары і начальнікі палітаддзелаў МТС асабова павінны забяспечыць бесперабойную работу машын.

ШТО ДАТЫЧЫЦЦА РУЧНОГА ЦЕРАБЛЕННЯ, ТО ТУТ ВАЖНЕЙШЫМ ПЫТАННЕМ З'ЯЎЛЯЕЦЦА АРГАНІЗАЦЫЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ ЗДЗЕЛЬШЧЫНЫ. Ручное церабленне застаецца галоўным спосабам уборкі і яму павінна быць аказана адпаведная ўвага. ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І ПАЛІТАДДЗЕЛЫ АБАВЯЗАНЫ РАСТЛУМАЧЫЦЬ КАЛГАСНІКАМ, ШТО ХЛЕБ, АТРЫМЛІВАЕМЫ КАЛГАСАМІ ЗА ЛЁН, ЗДАДЗЕНЫ ПА КАНТРАКТАЦЫІ, І ЛЁН, ПАКІНУТЫ Ў КАЛГАСЕ ПАСЛЯ ВЫКАНАННЯ ПЛАНА ІЛЬНАПАСТАВАК, БУДЗЕ РАЗМЯРКОЎВАЦЦА ПАМІЖ КАЛГАСНІКАМІ, ПРАЦАВАЎШЫМІ НА СЯЎБЕ, УБОРЦЫ, АПРАЦОЎЦЫ І ВЫВАЗЦЫ ІЛЬНУ. КАЛГАСНІКАМ, ЗАНЯТЫМ НА ЎБОРЦЫ І АПРАЦОЎЦЫ ІЛЬНУ ПРЫ ВЫКАНАННІ ДЗЕННАЙ НОРМЫ, НАЛІЧВАЕЦЦА ПА 2 ПРАЦАДНІ. АБ ГЭТЫХ СТЫМУЛАХ ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ КОЖНЫ КАЛГАСНІК.

Таксама павінна быць выканана пастанова ўрада аб парадку засыпкі насенных фондаў ільну.

Церабленне ільну толькі адкрывае вытворчы працэс. Апошняя задача заключаецца ў тым, каб атрымаць валакно, і пры тым, высокага нумара. Церабленне ільну павінна знаходзіцца ў арганічнай сувязі з расціпам і пераапрацоўкай. ВЯЛІКАЙ ПАМЫЛКАЙ БЫЛО-Б РАЗАРВАЦЬ НА ЧАСТКІ ГЭТЫ ПРАЦЭС. ДОБРЫ ЎРАДЖАЙ НА КОРАНІ МОЖА БЫЦЬ ЗАГУБЛЕН, КАЛІ Ў ТУЮ-Ж ГАДЗІНУ ПАСЛЯ ЦЕРАБЛЕННЯ НЕ ПРЫСТУПІЦЬ ДА СУШКІ, АЧОСУ І АБМАЛОТУ ГАЛОВАК, РАСЦІПУ І ПЕРШАПАЧАТКОВАЙ АПРАЦОЎКІ. Трэба дабіцца таго, каб асноўная маса ільну была паслана ў жніўні, не дапускаючы веснавога рассціпу.

Вялікае значэнне маюць ільназаводы па першапачатковай апрацоўцы. Такіх заводаў па Саюзу маецца больш 600. Наркамлегпром, у ведание якога перайшлі гэтыя заводы, павінен прыкласці ўсе намаганні к таму, каб рамонт заводаў быў скончан да 15 верасня, і забяспечыць заводы сыравінай і рабочай сілай. Нельга не ўказаць на тое, што заводы па першапачатковай апрацоўцы ільну да гэтага часу працавалі з няпоўнай прадукцыйнасцю.

Не меншае значэнне будзе мець абсталяванне калгасных ільнатрапальных пунктаў, прасцейшая механізацыя ручной апрацоўкі ільну.

БАРАЦЬБА ЗА ВЫКАНАННЕ ПЛАНА ЗАГАТОЎКІ ІЛЬНУ — ТАКАЯ-Ж ВАЖНЕЙШАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ ЗАДАЧА, ЯК І ВЫКАНАННЕ ПЛАНА ЗЕРНАПАСТАВАК. І тут нязбежна праўленне антыдзяржаўных тэндэнцый. І тут павінна быць большэвіцкая пільнасць.

У мінулым годзе многія раёны Заходняй вобласці і Беларусі, Урал і Заходняя Сібір, уборку правялі са значнымі стратамі толькі таму, што Ў САМЫМ ПАЧАТКУ ЎБОРКІ ДАПУСЦІЛІ САМАЦЁК, НЕ АРГАНІЗАВАЛІ ЯК НАЛЕЖЫЦЬ АПРАЦОЎКУ ІЛЬНУ. Такія факты не павінны паўтарацца. Арганізаванасць кампаніі, барацьба са стратамі на ўборцы і пры пераапрацоўцы, рашучае выкрыццё антыдзяржаўных тэндэнцый — вось што патрабуецца ад партыйных і совецкіх арганізацый і палітаддзелаў.

(З перадавога артыкула «ПРАВДЫ»).

АБ УБОРЦЫ І ПЕРШАПАЧАТКОВАЙ АПРАЦОЎЦЫ ІЛЬНУ

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР адзначае, што ўборка і першапачатковая апрацоўка ільну ў 1933 годзе была праведзена са значнымі стратамі, асабліва на Урале і ў Заходняй Сібіры, а таксама ў многіх раёнах Заходняй вобласці і Беларускай ССР.

Гэтыя страты былі выкліканы зацяжкай цераблення і абмалоту ільну, дрэнным выкарыстоўваннем ільнаўборачных машын, познім расціпам і несвоечасовым падняццем са сцелішчаў. Асабліва буйным недахопам у рабоце раду раёнаў з'яўляецца практыка адтрэміноўкі часткі рассціпу на вясну, якая прыводзіла да страт значнай часткі валакна.

Для недапушчэння паўтарэння недахопаў мінулага года і ў мэтах выканання плана збору і дзяржаўных заготовак ільну, а таксама павышэння якасці здаваемага па кантрактацыі дзяржаве валакна, Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляе:

Прапанаваць абласным і краявым выканаўчым камітэтам Заходняй, Ленінградскай, Іванаўскай, Маскоўскай і Свярдлоўскай вобласці, Паўночнага, Горкаўскага і Заходне-Сібірскага краёў і советам народных камісараў Украінскай ССР і Беларускай ССР:

1. Забяспечыць скончанне цераблення ў кожным асобным калгасе ў тэрмін не больш 8-10 дзён, у выпадку няроўчамернага пасявання ільну праводзіць выбарачную ўборку па меры пасявання ільну, не чакаючы спеласці ільну на ўсім участку.

2. Праверыць гатоўнасць МТС да выкарыстання ільнацерабільных машын, асабліва шыроказахватных ільнацерабілак. Абавязаць райвыканкомы, дырэктароў і начальнікаў палітаддзелаў МТС:

а) узяць пад непасрэдны нагляд спрэву падрыхтоўкі кадраў ільнацерабільнікаў;

б) забяспечыць адвод роўных і чыстых ад пустазелля ўчасткаў для машыннай уборкі;

в) устанавіць стражэйшы нагляд за якасцю рассціпу ільну і не дапускаць рассціпа тоўстым пластам, што прыводзіць да псавання ільну (пералежка, недалежка і, як вынік гэтага, стракатасць якасці ільну).

3. Закончыць рамонт усіх заводаў па первічнай апрацоўцы ільну да 15 верасня 1934 года, праверыць гатоўнасць заводаў да прыёмкі сыравіны, а таксама арганізаваць загатоўку і падвоз да іх неабходнай колькасці сыравіны. Забяспечыць заводы рабочай сілай для двухзменнай работы і арганізаваць на іх процілажарную ахову.

4. Забяспечыць скончанне будаўніцтва і рамонту сушылак, ёўняў, мачыльных ям і мяльна-трапальных пунктаў у калгасах да 1 верасня 1934 года і прыняць меры прыемствы па аблягчэнню ручной працы на ільнаапрацоўцы шляхам своечасовага абсталявання мяльна-трапальных пунктаў ільна-трапальнымі машынамі, бельгійскімі капёсамі, коннымі прывадамі, ільнамялкамі.

5. Прасачыць за тым, каб хлеб, атрымліваемы калгасамі за зданы па кантрактацыі лён, і лён, які застаецца ў калгасах пасля выканання плана здачы, размяркоўваўся па працаднях паміж калгаснікамі, працаваўшымі на сяўбе, уборцы, апрацоўцы і вывазцы ільну.

Устанавіць, што калгаснікам, працуючым па церабленню, абмалоту, рассціпу, пад'ёму, мяццю і трапанню ільну, налічваецца па 2 працадні пры выкананні дзённай нормы.

6. У мэтах забеспячэння калгасаў высокаякасным насеннем ільну для пасеваў 1935 года, устанавіць, што:

а) пры выкананні месячных планаў здачы ільну-сёмя, кантрактацыі, калгасы засыпаюць у насенны фонд па ільну-кудрэшу 15-20 проц., а па ільну-даўгунцу 30 проц. да абмалочанай колькасці сёмя;

б) праз 10-15 дзён па выкананню гадавога плана здачы ільнасёмя па кантрактацыі кожны калгас абавязан поўнасцю скончыць засыпку насенных фондаў.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР указвае, што паспяховае правядзенне сяўбы ільну-даўгунцу і добрыя ўмовы яго росту ствараюць магчымасць атрымання высокага ўраджаю ільну ў бягучым годзе. Совет Народных Камісараў Саюза ССР абавязвае совецкія органы і грамадскія арганізацыі ільнаводных раёнаў арганізаваць справу ўборкі і первічнай апрацоўкі ільну так, каб не дапусціць страт і забяспечыць здачу дзяржаве высокякаснага валакна.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ.

Кіраўнік справамі Совета Народных Камісараў Саюза ССР.

І. МІРОШНІКАЎ.

Масква, Крэмль.

8 жніўня 1934 года.

АБ ПАРУШЭННІ СОВЕЦКАЙ ПАЛІТЫКІ ЦЭН У НЕКАТОРЫХ КААПЕРАТЫЎНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б ад 8 жніўня 1934 года

Бюро ЦК КП(б)Б адзначае, што выяўленыя Дзяржаўнай інспекцыяй цэн факты парушэння совецкай палітыкі цэн, якія вызначаюцца ў незаконным устанаўленні рознічных цэн:

а) тварог пад відам пераапрацоўкі ў сырнікі прадаваўся па 5 руб. за кілограм замест устаноўленай цаны 1 руб. 30 кап. (64 крама МГРК—загадчык Капельсон, сталоўка друкарні імя Сталіна—загадчык Офенгейм, секцыя грамадскага харчавання МГРК—загадчык Родштэйн);

б) незаконнага продажу макарону па 88 кап. за кілограм замест устаноўленых 83 кап. (Віцебскі ЗВК);

в) продаж спыткаў па 20 кап. за штуку, замест устаноўленай этыкетнай цаны 5 кап. штука (Абчацкае селью);

г) продаж і купля тавараў оптам па рознічных цэнах (Гомельскі рабкоп закупіў у Днепрапетроўску на 29.026 руб. рыбтавараў оптам па рознічных цэнах. Менская крама ЗВК № 2 прадавала Абчацкаму селью оптам па рознічных цэнах розныя прэмтавары) і інш.

Гэтыя факты сведчаць аб тым, што за апошні час у радзе камерцыйна-гандлюючых арганізацый не толькі не аслаблі, але з новай сілай узмацніліся тэндэнцыі «нэпманскага духу» і нядбайных адносін да спажыўца. Адсутнічае якая-б там ні была ўвага і клопат за захаванне і павышэнне рэальнай зарплаты рабочых і таксама адсутнічае большэвіцкая барацьба з парушэннямі совецкай палітыкі цэн, чым па сутнасці парушаецца дырэктыва XVII партз'езда аб зніжэнні рознічных цэн на 35 проц. і давядзенне гэтага зніжэння непасрэдна да спажыўца.

З боку асобных гаспадарнікаў, парткомаў і прафкомаў не толькі не звяртаецца ўвага на справу якаснага снабжэння рабочых і на факты парушэння совецкай палітыкі цэн, але часамі яны становяцца на шлях абароны канкрэтных вінаватых, якія аказваюць супраціўленне Дзяржаўнай інспекцыі цэн у барацьбе з парушальнікамі совецкай палітыкі цэн (друкарня імя Сталіна).

Выходзячы з гэтага, бюро ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Загадчыка сталоўкі друкарні імя Сталіна тав. Офенгейма — кандыдата партыі—за куплю і перапродаж тварагу па незаконнай цане і грубыя адносіны да работнікаў Дзяржаўнай інспекцыі цэн, загадчыка менскага магазіна Дзяржшвэймашыны тав. Шпілевіча — кандыдата партыі — за водпуск швейных машын оптам па рознічнай цане—зняць работных іх з работы і справу аб іх партыйнасці перадаць у парткалегію.

2. Прыняць да ведама, што прэзідыумам БКС па пастанове СНК БССР вынесена спагнанне дырэктару Плодагародтрэста Гомельскага рабкопа тав. Гольдвееру — суровая вымова з папярэджаннем—за продаж бульбы па незаконнай цане, перабраўшы ад рабочых 16.620 руб.

3. Намесніку сакратара парткома друкарні імя Сталіна т. Струнскаму за перагаванне на факты парушэння совецкай палітыкі цэн з боку загадчыка сталоўкі, не глядзячы на паведамленні парткома з боку дзяржаўнай інспекцыі цэн аб'явіць суровую вымову.

Прапанаваць прэзідыуму ЦСПСБ прыцягнуць да адказнасці фабком друкарні імя Сталіна за дапушчэнне перавышэння цэн на тварог загадчыкам сталоўкі.

4. За апошні час выяўлены выпадкі водпуску тавараў каапературна-гандлюючымі арганізацыямі на папсаваных вагах і няправільнымі гірамі, чым па сутнасці тавар адпускаецца не чыстай вагой (з праверанымі 105 магазінаў па Менску ў 22 аказаліся няправільныя і папсаваныя вагі, няклеймёных гір ад двух год і больш у 13 магазінах).

Прыняць да ведама паведамленне аб тым, што СНК БССР разгледзеў пытанне арганізацыі праверкі вагавай гаспадаркі па БССР і ўстанавіў парадак набыцця і ўстаноўку ў магазінах кантрольных вагаў. Даручыць гаркомам і райкомам КП(б)Б устанавіць строгі кантроль за ажыццяўленнем паказанай пастановы СНК.

5. Прапанаваць Наркам'юсту тав. Кузьміну згодна дырэктывы пракурора Саюза тав. Акулава даць адпаведнае ўказанне мясцам аб своечасовым разглядзе матэрыялаў па фактах парушэння совецкай палітыкі цэн, прыцягваючы вінаватых да самай суровай адказнасці.

Прапанаваць рэдакцыям цэнтральных і раённых газет шырока асвятляць на сваіх старонках факты парушэння совецкай палітыкі цэн, паказваючы канкрэтных парушальнікаў, вядучы рашучую барацьбу супроць іх.

6. Прапанаваць упаўнаважанаму Дзяржаўнай інспекцыі цэн тав. Талкачову тэрмінова расследаваць факты куплі Гомельскім рабкопам у Днепрапетроўску оптам па рознічных цэнах рыбтавараў на суму 29.026 руб. і ОРС'амі эксплаатацыі 5 раёна Заходняй чыгункі Гомель на суму 41 тыс. руб., прыцягнуўшы вінаватых да суровай адказнасці.

7. Бюро ЦК КП(б)Б папярэджвае ўсе гаспадарчыя, партыйныя і профсаюзныя кіраўнікі арганізацыі прадпрыемстваў, горрабкопаў, ЗРК, ЗВК і ОРС'аў, што разам з канкрэтнымі вінаўнікамі яны нясуць не меншую адказнасць за факты парушэння совецкай палітыкі цэн.

8. Пастанову апублікаваць у друку.

ДОШКА ГОНАРУ

СТАРШЫНЬ ПЕРАДАВЫХ СЕЛЬСОВЕТАЎ

1. **ШАКАЛЯН,** Юркавіцкі сельсовет, Жыткавіцкага раёна.
2. **ЗАБЕЛА,** Старыцкі сельсовет, Капыльскага раёна.
3. **СІРОТКІНА,** Ульянаўскі сельсовет, Сенненскага раёна.
4. **КАЗЛОЎ,** Выханскі сельсовет, Гарадоцкага раёна.
5. **ПАСПЕЛАЎ,** Рагінскі сельсовет, Буда-Кашалёўскага раёна.
6. **ПЕТРАЖЫЦКІ,** Рэчыцкі сельсовет, Чэрыкаўскага раёна.
7. **ПАСТУШОНАК,** Галышанскі сельсовет, Лепенскага раёна.
8. **САПОНЕНКА,** Крычаўскі сельсовет, Брагінскага раёна.
9. **КАЛЕШКА,** Грэскі сельсовет, Слуцкага раёна.
10. **АКАРЦАЎ,** Свяцкі сельсовет, Лепельскага раёна.
11. **МЕЛЬНІК,** Языльскі сельсовет, Стара-Дарожскага раёна.
12. **ХОПЧЫК,** Залатоўскі сельсовет, Рэчыцкага раёна.
13. **КАЦУБА,** Асоравіцкі сельсовет, Камарынскага раёна.
14. **ЛАЎЧЫНСКІ,** Лазукоўскі сельсовет, Чашніцкага раёна.
15. **МЯЖУЕЎ,** Яромкаўскі сельсовет, Аршанскага раёна.
16. **БАГДАНОВІЧ,** Каз. Будскі сельсов. Чырвонапольскага раёна.
17. **ЖУРАЎСКІ,** Крушніцкі сельсовет, Лоеўскага раёна.
18. **РАЙХМАН,** Гілевіцкі сельсовет, Дуброўенскага раёна.
19. **БУРАЎСКІ,** Лешчанскі сельсовет, Бабруйскага раёна.
20. **ФЕЛЬДМАН,** Тураўлянскі сельсовет, Полацкага раёна.
21. **ВЯРТОШКА,** Пудацкі сельсовет, Суражскага раёна.
22. **ГАЙДУК,** Заборскі сельсовет, Расонскага раёна.
23. **ЦЫПІН,** Капланецкі сельсовет, Бярэзінскага раёна.
24. **КАРПАЎ,** Дзёрнаўскі сельсовет, Нараўлянскага раёна.
25. **ХАХЛОЎ,** Маслакоўскі сельсовет, Горацкага раёна.
26. **РЫНКЕВІЧ,** Жгуньскі сельсовет, Гомельскага раёна.
27. **СЕЛЯЗНЕЎ,** Касцюковіцкі сельсовет, Гомельскага раёна.
28. **КАТЛЯРОЎ,** Ракіянскі сельсовет, Клімавіцкага раёна.
29. **ПУКАЛАЎ,** Гапцукоўскі сельсовет, Уздзенскага раёна.
30. **САФОНАЎ,** Хоцькаўскі сельсовет, Чавускага раёна.
31. **ПЛЮСКЕВІЧ,** Добрасевіцкі сельсовет, Магілёўскага раёна.
32. **ПАПКО,** Весніцкі сельсовет, Ушацкага раёна.
33. **Марока,** Мосырскі сельсовет, Ушацкага раёна.
34. **ШМЕЛЬ,** Негарэльскі сельсовет, Дзяржынскага раёна.
35. **ГАРБАВЕЦ,** Старчыцкі сельсовет, Чырвона-Слабодскага р.
36. **САЎЧАНКА,** Чарапінскі сельсовет, Сіроцінскага раёна.
37. **КАЗЛОЎ,** Захоўскі сельсовет, Мсціслаўскага раёна.
38. **ПУДЗІКАЎ,** Славінскі сельсовет, Шклоўскага раёна.
39. **БУЛАВА,** Капатэвіцкі сельсовет, Петрыкаўскага раёна.
40. **ШЗУЧАНКА,** Казлоўскі сельсовет, Старобінскага раёна.
41. **ГОЛІКАЎ,** Гатавіцкі сельсовет, Заслаўскага раёна.
42. **САВІЦКІ,** Прылукскі сельсовет, Смалявіцкага раёна.
43. **ГАЛАВАЧЭНКА,** Літвінаўскі сельсовет, Парыцкага раёна.
44. **Шабан,** Хатаевіцкі сельсовет, Шкловіцкага раёна.
45. **Бузон,** Баранскі сельсовет, Барысаўскага раёна.
46. **МІШКІН,** Халопеніцкі сельсовет, Крупскага раёна.
47. **ЯНУШКЕВІЧ,** Бабініцкі сельсовет, Лепельскага раёна.
48. **ПІСАНКА,** Чырвона-Асвецкі сельсовет, Быхаўскага раёна.
49. **ГРЫНКЕВІЧ,** Грабянецкі сельсовет, Чэрвеньскага раёна.
50. **ФРАНЦУЗАЎ,** Бялыніцкі сельсовет, Бялыніцкага раёна.
51. **КАРОТКІН,** Алешаўскі сельсовет, Талачынскага раёна.
52. **КУЗЬМЕНКА,** Палескі сельсовет, Чачэрскага раёна.
53. **ГРАХОЦКІ,** Ласкавіцкі сельсовет, Глускага раёна.
54. **ЯНКОЎСКІ,** Стрэлічаўскі сельсовет, Хойніцкага раёна.
55. **ГАЛЫГІН,** Хальчанскі сельсовет, Веткаўскага раёна.
56. **СІМАНОВІЧ,** Барозаўскі сельсовет, Мазырскага раёна.
57. **БАЗЫЛЕВІЧ,** Біхажанскі сельсовет, Бешанковіцкага раёна.
58. **БРЭЛЬ,** Скародзянскі сельсовет, Ельскага раёна.
59. **ШРУБ,** Рычарскі сельсовет, Тураўскага раёна.
60. **ЯЗЭПАЎ,** Мяркулавіцкі сельсовет, Рагачоўскага раёна.
61. **ЧАЙКО,** Дзеракаўскі сельсовет, Асіповіцкага раёна.
62. **ДАШЧУК,** Уваравіцкі сельсовет, Уваравіцкага раёна.
63. **ЛЮБЕЗНЫ,** Насовіцкі сельсовет, Церахаўскага раёна.
64. **ШМІРАЎ,** Запольскі сельсовет, Суражскага раёна.
65. **ПЛІСКЕВІЧ,** Глыбачанскі сельсовет, Ушацкага раёна.
66. **ЕМЯЛЬЯНЦАЎ,** Трасцянецкі сельсовет, Касцюковіцкага р.
67. **ГЕНКІН,** Касцюковіцкі сельсовет, Крычаўскага раёна.
68. **ЛАПІЦКІ,** Дуравіцкі сельсовет, Буда-Кашалёўскага раёна.

УВАГА. Зняты з дошкі гонару за здачу першынства наступныя старшыні сельсоветаў: **Шчарбакоў**—Зайкаўскі сельсовет, Гарадоцкага раёна; **Ліпскі**—Нічыпараўскі сельсовет, Шклоўскага раёна; Барташоў—Бухарынскі сельсовет, Жлобінскага раёна.

За ўмелае арганізаванае і добрае правядзенне сельскагаспадарчай кампаніі занесены дадаткова на дошку гонару наступныя старшыні сельсоветаў: **Генкін**—Касцюковіцкі сельсовет, Крычаўскага раёна; **Лапіцкі**—Дуравіцкі сельсовет, Буда-Кашалёўскага раёна.

Раёны, непрыскаўшыя вестак: Менскі, Любаньскі, Прапойскі, Лагойскі, Бягомльскі, Кармянскі, Лельчыцкі, Атвейскі, Нухавіцкі і Быхаўскі.

ГОМЕЛЬ

НА ПРЫЁМАЧНЫМ ПУНКЦЕ АБВАЖВАЮЦЬ ЗДАТЧЫКАЎ

У апошнія дні на складзе ўсё часцей сталі паўтарацца выпадкі абважвання здатчыкаў. Гр-пу Гузаву, Старобінскага сельсовета, замест 134 кгр. жыта квітанцыю выпісалі на 34. Калі тав. Гузаў аб гэтым злачынстве прыёмшчыка Кагановіча давёс загадчыку прыёмачнага пункта тав. Славіну, яму чамусці дапісалі ў квітанцыю яшчэ 67 кгр., а астатняе так і не вярнулі. Грамадзянам Бёскі Залін'е, Урыцкага сельсовета, Волкаву Яўсею і Шушкіну Раману прыёмшчык Прыходзька выдаў квітанцыі — першаму замест 67 кгр. на 47 кгр., а другому замест 38 кгр. на 21 кгр. Скаргі гэтых грамадзян пакуль засталіся без усякага рэзультата.

Аб злачынствах прыёмшчыка Прыходзька скаргі паступаюць з пачатку прыёмкі зярна, але кіраўнікі Заготзярна (дырэктар тав. Федзін) не звярнулі на гэта ўвагі, а зараз яны яго перавялі ў больш бяспечнае месца... у веснны продмаг.

Пакуль ніякіх мер да другіх злачынцаў не прынята.

Большасць работнікаў з работай на пункце не спраўляюцца. Яны перабліваюць квітанцыі здатчыкаў, здаваемыя культуры, ствараюць вялікія чэргі.

Неабходна ў тэрміновым парадку перагледзець склад работнікаў прыёмачнага пункта і сурова карць абважвальнікаў здатчыкаў.

ПАЛЯШЧУК.

САБРАНЫЯ КАЛАСЫ ЛЯЖАЦЬ НА ПОЛІ

На палях калгасаў Бокшыцкага, Мусіцкага, Грэскага, Поклышчэўскага сельсоветаў ляжаць кучы згробленых і незвезеных з поля каласоў. Каласы гніюць пад дажджом, гніюць, аб'ядаюцца птушкамі, асыпаюцца.

Аналагічнае становішча і ў Окцябрскім сельсавеце.

Пакіданне сабраных у кучы каласоў на полі — масавае з'явішча ў раёне.

«Ну што-ж, калі настойваеце на зборы каласоў, будзем убіраць, але-ж усё роўна яны астануцца на полі» — такі новы кулацкі манеўр.

АНЕТ.

СЛУЦАК

МЕСЯЧНІК абмену вопытам

КАЛГАСНЫХ І БРЫГАДНЫХ ПАРТОРГАЎ

У выступленні тав. Вараб'ёва з'яўляецца вельмі каштоўным паказ вопыта па ўкараненні пры сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве чырвоных і рагожных сцяжкоў, вакол якіх вядзецца барацьба спаборнічаючых брыгад і звенняў.

Каштоўным з'яўляецца падыход і работа тав. Якаўлева з калгасным актывам.

Вопыт работы т. Якаўлева паказвае, як парторг шляхам індывідуальнага падыходу да калгаснікаў, гутарак з імі па асобных фактах дзённай работы дабіваецца пералому ў адносінах асобных калгаснікаў да працы.

ЯК МЫ АРГАНІЗАВАЛІ РАБОТУ НА ЎБОРАЧНАЙ

М. ВАРАБ'ЁЎ,

парторг калгаса імя Чарвякова, Мсціслаўскага раёна

Уборка ўраджаю і выкананне дзяржаўных абавязацельстваў — галоўны экзамен для мяне, як парторга.

Як перад уборкай, так і ў час уборкі мы шырока разгарнулі партмасавую работу ў розных формах, якія цалкам сябе апраўдалі ў час сяўбы і праполкі.

Мы правялі брыгадныя сходы, дзе падрабязна абгаварылі планы ўборкі. Паміж брыгадамі і звенямі заключылі дагаворы на соцспаборніцтва.

Брыгада № 2 Цырынава заключыла дагавор з брыгадай № 5 Шалабодава. Галоўныя пытанні дагавораў: уборка ў спісныя тэрміны; барацьба са стратамі, як галоўная задача; выкананне гадавога плана дзяржпаставак к 1 верасня. Перадавая брыгада — чырвоны сцяжок, адстаючай — рагожка.

Пачалося ўпартае змаганне за чырвоны сцяжок. Ніхто не хацеў апрыпаць рагожку. У спаборніцтве двух брыгад пераможцам вышла брыгада Цырынава: жыта і ячмень зжала ў 6 дзён, першай у калгасе пачала хлебапастаўкі, здаўшы 26 ліпеня 19 цэнтнераў добраякаснага зярна. Якасць работы ў брыгадзе Цырынава — самая лепшая. Прайдзіце па іржышчы — ніводнага каласка не знойдзеце. Але... пярэшнства брыгада не заваявала —чырвоны сцяжок астаўся ў брыгадзе № 2, якая заваявала яго ў час сяўбы, не здала ў час касьбы, не здала і ва ўборачнай. Не адсталі і іншыя брыгады — калгас закончыў жніво ранніх зернавых у 7 дзён. Рагожка асталася брыгадзе № 10 за адставанне ў сенаўборцы, а пасля і ва ўборцы зернавых. Тады на дапамогу 10 брыгадзе пераключыліся 2, 3, 4 і 8 брыгады. Адстаючую брыгаду выцягнулі, але рагожка засталася за ёй.

— Завяшце самі права на здачу рагожкі, — заявілі перадавыя брыгады.

У кожнай брыгадзе выбралі рэдкалегію. Правялі нараду рэдкалегій сумесна з селькорамі. Далі наказ: штодзённа выпускаць лічыўку. Для тэхнічнага афармлення газет прымацавалі да іх 2-3 школьнікаў.

Работу рэдкалегіі правяраў я сам, бо ведаў: не праверыш, — зацягнуць выпуск газеты. І, трэба сказаць, брыгадная газета адыграла выключную ролю ў пачуванні ўборкі. Вечарам кожны мог бачыць результаты работы брыгады за дзень: хто адстае, хто ўперадзе. Адстаючыя заўсёды на заўтра выходзілі ўперад.

Быў такі выпадак. Брыгада № 12 (брыгадзір Керасіраў Андрэй) у час жніва жыта выходзіў на работу ў 8-9 гадзін. Калі прабралі гэту брыгаду ў пасцегнгазеце, на заўтра глядзіш — брыгада ў 4 гадзіны, чуць свет, ужо працавала.

У кожнай брыгадзе былі заведзены чырвоныя і чорныя дошкі. Невыкананне норм выпрацоўкі, дрэнная якасць, нявыхад на работу — усё гэта заносілася на чорную дошку. І, наадварот, лепшыя паказчыкі заносілі на чырвоную дошку. Кожны лічыў сваім гонарам быць на чырвонай дошцы. Занясенне на чорную і чырвоную дошку правяраў я і старшыня калгаса. Калгасніцы Кускова Елізавета па праполцы ільну не выконвала норм выпрацоўкі. Ва ўсіх былі чыстыя, праполатыя ўчасткі ільну, а яе ўчастак зарос зеллем. А Елізавета не спяшалася, палола па-маленьку, праполваючы 0,05-0,10 га ў дзень. На яе ўчастак пастасілі чорны сцяжок. Пакрыўдзілася Елізавета: «Ах, каб вас чорт узяў, ды вы яшчэ сцяжкамі будзеце тыкаць мяне». Узлавалася і закапала сцяжок у зямлю. Абурыліся ўсе калгасніцы ўчынкам Елізаветы, саромілі яе. Пагаварылі мы з ёю, растлумачылі. Зразумела Елізавета правільны шлях калгасніц. Адкапала чорны сцяжок, умацавала яго па-ранейшаму на сваім участку і замест нормы выпрацоўкі 0,12 гектара давала ў дзень 0,25 гектара. Участак ільну быў праполат. Чорны сцяжок знялі.

Зараз адказнейшы ўчастак—малацьба, працуюць тры поўскладаных і адна складаная малатарні. Зярно прама з пад малатарань накіроўваем на склады Заготзярно. Мы арганізавалі комсамольска-маладзёжную брыгаду па малацьбе на чале з комсамольскім арганізатарам Баталовым К., да кожнай малатарні прымацавалі члена партыі. Я падзяліўся вопытам работы толькі на адным участку. Недахопаў у рабоце многа. Аб'ўлены ЦК КП(б)Б і «Звяздой» месячнік абмену вопытам работы парторгаў дапаможа мне наладзіць работу на ўсіх участках.

ЯК Я ВЫВУЧАЮ І ВЫХОЎВАЮ АКТЫЎ

ЯКАЎЛЕЎ,

парторг і старшыня калгаса „Парыжская комуна", зоны Магілеўскай МТС

Прыступаючы да работы, я добра памятаў указанні палітаддзела, што калгас можна вывесці з прарыву толькі тады, калі я вакол сябе згуртую моцнае ядро калгаснага актыва, лепшых і адданых справе калгаснікаў-ударнікаў.

Па-другое, ніколі не забываў, што я не толькі старшыня, адміністратар і адзінаначальнік у калгасе, а перш за ўсё комуніст, партыйны арганізатар, што асноўнай умовай у забеспячэнні добрых тэмпаў і якасці ў рабоце калгаса з'яўляецца перавыхаванне ў калгасным духу былых аднаасобнікаў.

Не адзін вечар я праседжваў над працоўнымі кніжкамі калгаснікаў, імкнуўся вывяць па працаднях, па выкананню задання іх адносіны да працы, пільна сачыў за выступленнямі калгаснікаў на калгасных сходах, а таксама ў гутарках з асобнымі калгаснікамі выяўляў іх адносіны да калгаснай справы. Мімаволі зараз успамінаецца мне той дзень, калі праўленне калгаса абмяркоўвала, на якіх участках трэба будзе сеяць тэхнічныя культуры. У гэтым абмеркаванні прымалі ўдзел перадавыя калгаснікі. Тады-ж адзін з іх, па першы погляд далёка не актывіст, СЦЯБЛІНСКІ ЗАХАР, выступіў супроць пастановы праўлення аб вызначэнні ўчасткаў пад авёс. «Калі там пасеем», заўважыў ён, «ураджаю не знімем, бо на тым участку ўжо ў мінулым годзе быў авёс».

Адначасова СЦЯБЛІНСКІ вынес сваю прапанову, дзякуючы якой пад авёс і іншыя культуры праўленне вызначыла ўчасткі з добрымі папярэднікамі. Я і пасля заўважаў, што СЦЯБЛІНСКІ сваімі парадамі мне значна дапамагае ў рабоце. Я пачаў з ім раіцца, а пасля вылучыў яго на пасаду брыгадзіра паляводчай брыгады.

Так з дня ў дзень, выяўляючы лепшых ударнікаў, згуртоўваючы іх вакол сябе, я абрастаў надзейным актывам. Калі трэба правесці якое-небудзь важнае мерапрыемства, выканаць дырэктыву партыі і ўрада, я збіраю свой актыў, прапрацоўваю з імі важнейшыя палітычныя дакументы і абмяркоўваю як лепш і хутчэй выконваць задачу.

За год калгаснікі не мелі ніводнага адміністратыўнага спагнання. Быў час, калі ВАРАБ'ЁЎ АЛЕСЬ лічыўся першым гультаём у калгасе. Не раз, я заўважаў, як ён збіваў свайго каня да крыві. Гэта прымусіла мяне выклікаць Вараб'ёва і добра з ім пагаварыць. Такіх гутарак было некалькі, і ў рэзультаце без адміністратыўных спагнанняў я дабіўся таго, што Вараб'ёў стаў адным з лепшых ударнікаў калгаса.

Такім чынам я магу зрабіць вывад. Каб дабіцца добрых тэмпаў і якасці ў рабоце калгаса, партарганізатару трэба перш за ўсё звярнуць увагу на тое, каб вакол яго быў добра арганізаваны і згуртаваны калгасны актыў, каб было на кага абаперціся ў правядзенні той або іншай работы.

Тав. Шустэр — рабочы закройнага цэха менскай чырвонасцяжнай фабрыкі «Окцябр», сістэматычна перавыконвае норму і выпускае добраякасную прадукцыю.

ФАБРЫКА „СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" УКЛЮЧЫЛАСЯ Ў ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЗІМЫ

На фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» пырока разгарнулася падрыхтоўка да зімы.

Для рамонту рабочых кватэр лепшым ударнікам сталінскай брыгады вылучана са сродкаў фабкома 6000 руб., а касы ўзаемадапамогі 4000 руб., ад дырэкцыі фабрыкі — 13000 руб., усяго 23.000 р.

Да 1 верасня будзе закончана пабудова 16 кватэр для лепшых ударнікаў фабрыкі.

Арганізуецца калектыўны рамонт абутку і зімовай вопраткі для рабочых і іх сем'яў, для чаго з дапамогай падшэфнай арцелі «Уперад» пашыраюцца нашывачная і абутковая майстэрні.

Да 15 верасня намечана закончыць унутраную падрыхтоўку фабрычных будынкаў, падсобных устаноў (сталовая і клуб, вучэбны камбінат, яслі, дзіцячы сад і інш.).

На 1 верасня будзе закончана пабудова гародніна-хавальнікаў, і месцы для хавання гародніны, і насення для індывідуальных агародникаў.

Будуць пабудаваны гародніна-хавальнікі для індывідуальных агародникаў, пражываючых у фабрычных дамах, а таксама аказана дапамога матэрыяламі для пабудовы хавальнікаў астатнім агародникам.

Мяркуем заключыць дагаворы з падшэфнымі калгасамі па аказанню дапамогі ў падвозцы дроў рабочым па ільготных цэнах.

Мы звяртаемся да Віцебскага горсавета, каб ён нам дапамог праз жакты ў рамонце кватэр рабочых, пражываючых у жактах.

Актыўным удзелам усіх фабрычных арганізацый і рабочых мы сустрэнем зіму 1934 года ў поўнай гатоўнасці і зробім кватэры рабочым цёплымі і ўтульнымі.

Трыкутнік фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі»

РОХКІН, КАЛАБКОЎ, КАПЕР.

ДЗІЦЯЧАЯ СКРЫПКА*)

ПЯТРУСЬ БРОЎКА

Мне хацелася плакаць. Так я разлучыўся са скрыпкай.

Так я пакінуў музыку.

І вось іншоў я прыгадаў тую скрыпку цяпер. Я сядзеў і напружана глядзеў на сцэну. Гэта быў агляд юных талантаў. Перад тысячнай аўдыторыяй выходзілі і паказвалі свае здольнасці надзвычайна здатныя дзеці. Вось Міша Іонтаў іграе на скрыпцы. Яму восем год. Ён трымае скрыпку ўпэўнена, як дарослы. Спрытнаю рукою ён вядзе смычком і струны гавораць за яго. Ён вучыцца на класу скрыпкі ў педагога Жыва. Ён іграе канцэрт Віваальдзі.

Я ўвесь час думаю пра іх—бадзёрых нашых совецкіх дзяцей. Колькі бацькаўскага клопату аддае ім наша партыя і совецкі ўрад, каб зрабіць іх шчаслівымі.

Вось вам невялічкі прыклад. Спецыяльная камісія сядзіць у габінеце наркома асветы тав. Чарнушэвіча. Тут сам нарком, заслужаны артыст рэспублікі тав. Гіттарц, выкладчыкі Дзяржаўнай кансерваторыі т.т. Бяесмертны, Арлоў, Герман і Гуральнік. Чаго сабралася такая аўтарытэтная адказная камісія? Спачатку гэта проста дзіўна. Перад імі невялічкая пяцігадовая дзяўчынка. Здавалася-б, што ёй толькі куляць у цацкі. Але тут зусім другое. Гэтай пяцігадовай дзяўчынцы Зоі Сабалеўскай падаюць скрыпку. І цуда—праўда, па-дзіцячаму, але пераканаўча яна пачынае іграць. Камісія ўхваліла вучыць Зою. А Коля выяўлены палітаддзелам і прысланы на вучобу. Хлапчук Адліванкін вучыцца ў кансерваторыі і быў пасланы на курорт.

Пры Беларускай Дзяржаўнай Кансерваторыі ёсць спецыяльная аддзяленне юных талантаў, яно забяспечана лепшымі прафесарамі, выкладчыкамі. Яны абслугоўваюцца лепшымі дактарамі.

Гэта толькі частка таго, што я хацеў сказаць. Я гляджу на іх, маіх малодшых таварышоў, і заінтрэсаваны шчу. Як добра нарадзіцца і жыць у такі час! Кожны талант у нашай краіне мае поўныя магчымасці яго свайго выяўлення.

І капі гляджу на іх, маіх малодшых братоў і сясцёр, я ўспамінаю сваю пакутную скрыпку і радуюся за іх.

*) Артыкулы тт. Пятруся Броўкі і Ал. Дудара, якія не ўвайшлі ў старонку «Бурна расце і квітнее беларуская социялістычная культура» («Звязда» ад 9 жніўня), змяшчаюцца ў гэтым нумары.

ШЧАСЦЕ МАЙГО ПАКАЛЕННЯ

АЛ. ДУДАР

Маё пакаленне—самае шчаслівае ў свеце. Жыць у эпоху, калі памірае адна культура і нараджаецца другая — гэта рэдкае і высокае шчасце.

Мы нарадзіліся ў цёмную пару, калі дагаралі апошнія нэндзныя агаркі таго, што імкнавалася культурай Расійскай імперыі. Мы вырасслі і ўзгадаваліся ў дні, калі на шостай частцы зямлі расце новая высокая культура, розная па формах, але адзіная па свайму зместу. Мы не спальваем мастацкай літаратуры на гарадскіх плошчах, але падвойваем і патройваем яе тыражы. Мы не разваливаем помнікаў нашых класікаў, не цягаем на вяроўках іх статуі — мы ўзводзім новыя помнікі людзям, якія ўмелі закрануць і арганізаваць нашы пачуцці. Мы называем вуліцы і цэлыя гарады імёнамі нашых любімых аўтараў. Мы ажыўляем і разгортваем культуры такіх народаў, імёны якіх раней былі вядомы толькі вузкім спецыялістам-этнографам. І ў кожнай з такіх культур мы ўмеем адсеяць чужое, варожае і малакаштоўнае і выбраць чыстае зерне сапраўднага золата думкі і пачуцця. Мы жывем у дні мужнасці класа і маладосці чалавецтва.

Паглядзіце, якія вышыні дасягнула беларуская совецкая культура?

Не тэкі яшчэ далёкі той час, калі ўсю кніжную прадукцыю на беларускай мове, уключаючы «мастацкія творы» Лёсіка і «навуковыя трактаты» Ластоўскага, можна было свабодна размясціць у аднэй вітрыне невялікага магазіна. А цяпер раманы і аповесці беларускіх совецкіх пісьменнікаў разыходзяцца шматтысячнымі тыражамі, перакладаюцца на іншыя мовы, зачытваюцца да дзірак. Ад «Збянтэжанага Саўкі» ў рэпертуары нашых тэатраў да гукавых фільмаў на беларускай мове прайшло толькі 10-15 гадоў, а здаецца, што не менш як 100 гадоў таму назад «Міхалка» і «Збянтэжаны Саўка» былі асновай нашага тэатральнага рэпертуара.

Дзесяткі вышэйшых навучальных устаноў, газеты, выходзячыя ў самых глухіх і закінутых мястэчках, сталіца на месцы другараднага губернскага горада—вось новая культура, культура пролетарыята, культура новага чалавецтва ў нашай, калісці адсталай, краіне.

У Чырвонай арміі няма непісьменных. Але пісьменнасць скарыстоўваюць байцы не на псалтыр, не на часаслоў, не на далёўскія «Солдатские досуги», а на азнаямленне з лепшымі творамі беларускай, рускай і сусветнай літаратуры. На стале ў бібліятэцы ляжаць да рэнты зачытаныя творы Коласа, Галавача, Мурашкі і інш. Гэтыя кнігі чытаюцца ў палатцы, у часе адпачынку, абмяркоўваюцца ў таварыскай гутарцы і на літтурку. Унукі драгамірыўскіх нявольнікаў чытаюць Дзікенса і Флобера, але яны не чытаюць і не хочуць чытаць нацдэмаўскую мазню розных Гарэцкіх: такія кнігі неразрэзанымі валяліся на некалькі гадоў у шафах і такімі былі выкінуты. Цікава ўспомніць аб праведзеных у часе лагерных масовак літаратурных віктарынах: не толькі ні адно з пытанняў не аставалася без адказу—самыя адказы байцы давалі часамі ў разгорнутай форме, паказваючы сур'ёзнае ведамства з гісторыяй літаратуры, з лепшымі мастацкімі творамі сучаснасці і мінуўшчыны.

Наша культура не мае нічога супольнага з дутай культурай кавярмы, шынкоў і бульварнай прэсы. Культура ў нашай краіне прыйшла высока. Але гэта не музейная цнатлівасць, якая хаваецца ад шклом і пакрываецца пылам хаваннасці і недаступнасці. Наша культура жыве і расце ў самых шырокіх масах, у самых далёкіх і глухіх кутках, дзе жывуць грамадзяне нашай краіны, дзе ёсць хоць драбнейшае звяно партыі. І мае пакаленне павінна лічыць за высокае шчасце тое, што перад ім нічога дасягнуць гэ цікавейшага жыцця, цікавейшай працы, цікавейшага і нечуванага дзейсцвіцца і росту новай культуры.

Зверху: школа ў калгасе „Чырвоны бераг", пераабсталяваная з панскага брацэра. Унізе: вуліцы калгаса „Чырвоны бераг" (Барысаўшчына).

ІКАР

КАНФЛІКТ ФАШЫСЦКАЙ ІТАЛІІ З ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІЯЙ

I

Забойства аўстрыйскага канцлера Дольфуса абвастрыла да крайнасці супярэчнасці ў цэнтральнай частцы Еўропы. Недарма гэта смерць супастаўлялася друкам з забойствам 14 ліпеня 1914 года ў Сараева аўстрыйскага эрцгерцага, забойствам, пацягнуўшым за сабой выбух сусветнай бойні.

Падзеі, якія разгарнуліся ў Аўстрыі ў канцы ліпеня 1934 года, таксама раскрылі вароты ваенным ветрам. На вялікіх дарогах, вядучых у Аўстрыю, ужо чуецца грукат перавальваючыхся танкаў, шум матораў, тупат дзесяткаў тысяч салдацкіх ног. Італія рушыла да аўстрыйскіх граніц 50.000 войск. Усе горныя праходы з Італіі ў Аўстрыю поўны перасоўваючыхся войск. Югаславія і Чэхаславакія са свайго боку таксама спятваюць ваенныя сілы да аўстрыйскіх граніц. Таго і глядзі, як сказаў гэтымі днямі французскі ваенны міністр маршал Пётэн, бліснае маланка, і вайна разрэзіцца з нечуванай сілай.

Маленькая і ціхая Аўстрыя стала плацдармам, над якім згусціліся хмары новай вайны. У якасці галоўных працоўнікаў высунуліся сілы да гэтага часу выступаўшыя салідарна, аказваўшыя адзін другому падтрыманне. Германія і Італія. Мусаліні і Гітлер хіба не абменьваліся зусім нядаўна сімпатыямі, прывітаннямі, дружнымі пачуццямі.

II

14 чэрвеня г. г. Гітлер прыляцеў на аэраплане ў Венецыю ў госці да Мусаліні. Якое ўрачыстае спатканне наладзіла Гітлеру фашысцкая Італія!

Музыка, парады, прыёмы, маніфестацыі, авацыі...

Партрэты Гітлера стракацелі на старонках усіх газет і журналаў. Італьянскі друк прысвячаў яму поўныя запалу артыкулы. Гітлер маляваўся ў іх дастойным паслядоўцам Мусаліні. Сустрэча кіраўнікоў абодвух дзяржаў, дзе панае фашысцкая дыктатура, выдавалася як велізарнейшая падзея ў сусветнай гісторыі. Гутаркі, якія Мусаліні і Гітлер мелі, на адзінокай вілле каля Венецыі адбываліся адзін на адзін. Толькі чацвера вачэй, толькі два сугутарнікі, абодва неабмежавана распараджаючыяся лёсамі сваіх народаў, матлі дагаварыцца ца — душах пра ўсіх вострых пытаннях, хвалюючых раздзіраемы міжусобіцай капіталістычны свет. І газеты ў Германіі, і газеты ў Італіі, і там і тут, вымуштраваныя, з вялікім уздымам распявалі адзін і той-жа матыў: Італія і Германія трымаюць у сваіх руках лёсы еўрапейскага свету; фашызм дапамог ім знішчыць унутранога ворага, знішчыць класавыя супярэчнасці; абедзве фашысцкія дзяржавы даюць свету узор вырашэння складанейшых міжнародных праблем.

Па асноўнаму прадмету абмеркавання — аўстрыйскаму пытанню, Мусаліні атрымаў урачыстае запэўненне Гітлера, што Германія будзе ўважаць незалежнасць Аўстрыі; так стваралася грамадская думка.

III

Потым прайшлі два тыдні. Наступіла спачатку 30-га чэрвеня ў Германіі, а потым 25 ліпеня ў Аўстрыі.

30 чэрвеня Гітлер расправіўся з глашатаямі «другой рэволюцыі»; выразаўшы каля сотні кіраўнікоў штурмавікоў і распусціўшы карычневую армію, Гітлер даў поўнае задавальненне прамыслоўцам і генералам. За размовы аб другой рэволюцыі быў абвешчан расстрэл. Так рухнула ў Германіі фашысцкая казка аб адзінай нацыянальнай бясклассавай дзяржаве. Так выкрыла разня 30 чэрвеня социяльную сутнасць фашысцкай імперыі, як панавання рэакцыйнейшых фінансавых, прамысловых і генеральскіх колаў.

Прайшло яшчэ тры тыдні і наступіла 25 ліпеня, мяцеж нацыянал-социялістаў у Вене і забойства Дольфуса, узарваўшае гармонію італа-германскай дружбы. Італія верыла ў Гітлера. Яна мела надзею на венецыянскую дружбу двух дыктатараў. Яна давярала абяцанню Гітлера шанаваць незалежнасць Аўстрыі. І што-ж? 25 ліпеня аўстрыйскія нацыянал-социялісты захапляюць у Вене будынак урада, забіваюць Дольфуса—старога прыяцеля і саюзніка Мусаліні, а абрадаванае германскае афіцыяльнае бюро друку спяшаецца апавясціць усяму свету смерць аўстрыйскага канцлера.

У выпушчаным Германіяй паведамленні гаварылася: «Аўстрыйскі народ узняўся для таго, каб судзіць урад Дольфуса. Германскі народ Аўстрыі ўзбунтаваўся супроць сваіх мучыцеляў і прыгнятальнікаў. Гэта вялікае народнае паўстанне спатканае разуменне з боку ўсіх, хто назіраў тэрор і цярпеў ад тэрора ў Аўстрыі. Узняўся ўвесь народ Аўстрыі, германскі народ будзе вітаць перамогу над урадам Дольфуса».

IV

Якую-ж перамогу вітала Германія? На што разлічваў германскі фашызм? Смерць Дольфуса павінна была расчысціць дарогу да перахоплу ўлады ў рукі аўстрыйскіх гітлераўцаў. Усё прадпрыемства 25 ліпеня было выканана па германскай указцы. Аўстрыйскі легіён, створаны пры штаб-кватэры нацыянал-социялістаў у Германіі, толькі чакаў моманту, каб перайсці на сігналу граніцу і давяршыць трыумф нацыянал-социялізма ў Аўстрыі.

Але ўрад нацыянал-социялістаў азначае канец самастойнай незалежнай Аўстрыі. Нацыянал-социялісцкая Аўстрыя гэта ўжо неадлучная частка фашысцкай Трэцяй Імперыі. Хоць гэта прадпрыемства правалілася, але Італія пераканалася, як вяліка была небяспека.

Забойства Дольфуса і спроба захвату ўлады ў Аўстрыі—такі адказ на парады, захапленні і авацыі, што аказваліся Гітлеру гарачымі італьянцамі. Італію ашукалі. Трэба бязлітасна выкрыць ашуканцаў.

Рымскі орган італьянскага фашызма «Пополо ді Рома» перадае гэтыя пачуцці наступным чынам: «Германскі ўрад шмат раз абяцаў нам не ўмешвацца ва ўнутраныя справы Аўстрыі; ён не стрымаў сваіх абяцанняў, з гэтага мы можам зрабіць адно заключэнне: або Гітлер парушыў свае слова, або ён не здолеў яго стрымаць. Мы адпраўляемся ад таго пункту гледжання, што свету патрэбны дыктатары, але не людзі, якія ілгуць, а яшчэ менш свету патрэбны бездапаможныя правадыры».

Другая рымская газета «Месаджэро» пісала: «Занадта часта германскі ўрад не стрымліваў дадзага слова. Занадта часта ён вёў перагаворы з адзінай мэтай—выйграць час і заблытаць становішча. З тым, хто шматразова і цынічна наступаўся ўласным гонарам, нельга размаўляць як з маральна роўным. Не існуе ніводнага ўрада ў свеце, які-б не быў у праве набыць у адносінах да Германіі поўную свабоду дзеяння».

Фашысцкая Германія, наперакор слову, данаму Гітлерам, рашыла, праглынуць Аўстрыю—вось што стала зразумела пасля 25 ліпеня ў Італіі і вось супроць чаго ўзняўся італьянскі фашызм.

V

Хоць у Германіі і Італіі на чале ўлады стаяць фашысцкія ўрады, інтарэсы італьянскага фашызма і гітлераўскай Германіі далёка не зусім супадаюць. Першае пяцігоддзе фашысцкай дыктатуры ў Італіі прайшло, наадварот, пад знакам рэзкіх канфліктаў фашысцкай Італіі з Германіяй, выкліканых фашысцкай расправай з нацыянальнымі правамі нямецкага насельніцтва ў Верхнім Адыжы (частка паўднёвага Тыроля), далучаным пасля вайны да Італіі. Яшчэ да захопу ўлады, у 1922 годзе, фашысты абрушыліся на нямецкія гарады гэтай правінцыі, выгналі адтуль нямецкую адміністрацыю, паставілі на яе месцы сваіх камісараў, спецыяльна для недапушчэння немцаў да муніцыпальнага кіраўніцтва. Пасля прыходу да ўлады фашызм пачаў бязлітасную італьянізацыю ўсяго далучанага да Італіі Тыроля. Нямецкая мова ў гарадах і мястэчках з нямецкім насельніцтвам была абвешчана пад забаронай. Усе нямецкія школы закрыты, усе нямецкія шыльды зняты, усе немцы выгнаны з дзяржаўнай і комунальнай службы. На спробы нямецкага насельніцтва арганізаваць прыватныя нямецкія школы ўрад адказаў жорсткімі рэпрэсіямі. Неадаўшыеся нямецкія настаўнікі, якія прабавалі прадаўжаць сваю педагагічную практыку, былі пачкамі сасланы на астравы. Тая запятая чыстка Тыроля ад усяго нацыянальна-нямецкага прадаўжалася на працягу некалькіх год і выклікала ўзбуджаныя пратэсты з боку Аўстрыі і Германіі.

Пазней, пасля прыходу да ўлады нацы, Італія выступіла з настойлівымі папярэджаннямі супроць спроб Гітлера дабіцца далучэння Аўстрыі шляхам правядзення ў Вене нацыянал-социялісцкага перавароту. Італьянскі фашызм пакравіцельствуе аўстрыйскаму хеймверу (ваенная арганізацыя аўстрыйскіх фашыстаў), кіраўнік хеймвера князь Штарэмберг з'яўляецца верным супрапоўнікам і вучнем Мусаліні. Фашысцкая Італія аказвала садзейнасць канцлеру Дольфусу, зрабіўшаму аўстрыйскую канстытуцыю на свае суперніцтва з Гітлерам на падтрыманні Мусаліні. Аўстрыйская буржуазія, непажадаўшая падпарадкавацца Гітлеру, іменна ў Італіі бачыць сваю галоўную апору і абарону ад фашысцкай Германіі.

VI

Аўстрыя з'яўляецца звяном у створаным Мусаліні дунайскім блоку дзяржаў—Італіі, Аўстрыі і Венгрыі. 17 сакавіка гэтага года ў Рыме быў заключан дагавор, які аформіў гэты блок. Рымскі дагавор устанавіў прынцыпы цеснага супрацоўніцтва трох дзяржаў у эканамічнай галіне і ва знешне-палітычных пытаннях. Дунайская згодай Італія забяспечыла Венгрыю закупкай яе зярна, а Аўстрыю закупкай лесу і некаторых прамысловых тавараў, у абмен Аўстрыя і Венгрыя абавязаліся забяспечыць італьянскія парты Трыест і Фіуме транзітам сваіх тавараў. Дагавор прадставіў таксама асобныя ільготы італьянскаму прамысловаму экспарту ў Аўстрыю і Венгрыю.

Мусаліні разлічвае, што Італія, як глава і арганізатар Дунайскага блока, зможа абаперціся на яго ў барацьбе супроць Францыі і супроць саюзнікаў Францыі ў Цэнтральнай Еўропе—Малай Антанты. Выпадзенне Аўстрыі з Дунайскага блока, ператварэнне яе ў частку Трэцяй імперыі, калі-б гэта Гітлеру ўдалося, зруйнавала-б увесь Дунайскі план Мусаліні. Венгрыя, якая з'яўляецца зараз саюзніцкам Італіі, стаўшы суседкай Германіі, не ўстаяла-б у сваю чаргу ад саюза з Трэцяй імперыяй. Гегемонія на Балканскім паўвостраве, за якую змагаецца фашысцкая Італія, перайшла-б у рукі гітлераўскай Германіі. Але Трэцяя імперыя захвала на Балканах тыя-ж планы, якія да 1914 года ажыццяўляліся кайзераўскай Германіяй. Замаскаваўшыя II Аўстрыі і Венгрыі, Германія пачне прасоўваць свае шчупальцы на поўдзень, у бок Грэцыі і Албаніі. Гэта ажыццяўленне ўжо поўнае выцясненне з Балкан Італіі і ператварэнне яе з вялікай дзяржавы ў другарадную дзяржаву. Тады і паўднёвы Тыроль, забыты Італіяй у рэзультаце перамогі сапраўды жыве і расце ў самых шырокіх масах, у самых далёкіх і глухіх кутках, дзе жывуць грамадзяне нашай краіны, дзе ёсць хоць драбнейшае звяно партыі. І мае пакаленне павінна лічыць за высокае шчасце тое, што перад ім нічога дасягнуць гэ цікавейшага жыцця, цікавейшай працы, цікавейшага і нечуванага дзейсцвіцца і росту новай культуры.

VII

Фашысцкая Італія сімпатызавала метадам германскіх нацыянал-социялістаў, калі яны распраўляліся з германскімі рэволюцыйнымі рабочымі масамі. Але калі дранежны твар Трэцяй імперыі паказаў сваё аскал на самых границах Італіі, італьянскі фашызм апчаўпіўся за свайго боку.

14 чэрвеня на спатканні ў Венецыі Мусаліні і Гітлер думалі ашаламіць свет якімісці новымі метадамі фашысцкай замежнай палітыкі. Забойства Дольфуса і выступленне нацы ў Вене 25 ліпеня далі ўсяму свету нагадны і канкрэтны ўрок гэтай навейшай фашысцкай дыпламатыкі.

А ў адказ рух італьянскіх войск да аўстрыйскай границы з'яўляецца дадатковай ілюстрацыяй да гэтага ўроку.

КАЛІ У ОРШЫ ПАЧНУЦЬ ЭМАГАЦЦА З ЖУЛІКАМІ І СПЕКУЛЯНТАМІ?

Друкуемая карэспандэнцыя гаворыць аб тым, што Аршанскі РК, райпрофсавет і аршанская пракуратура па-апартуністычнаму аднеслі-ся да сігналаў «Звязды» аб жульніцкім абважанні пакупнікоў у мазагазінах Оршы, аб спекулятыўным павышэнні цэн. Між тым гэтыя жульніцкія і спекулянцкія махінацыі прадаўжаюцца. Мы запытваем: калі-ж аршанскія арганізацыі возьмуцца за правядзенне ў жыццё важнейшых дырэктыў партыі і ўрада аб барацьбе з жулікамі і спекулянтамі, абкрадваючымі працоўнага пакупца.

Яшчэ 23 ліпеня «Звязда» ў карэспандэнцыі «У аршанскіх магазінах абважаюць пакупца» сігналізавала аб сур'ёзных парушэннях цэн, аб жульніцтве і абважанні спажыўцоў крамшчыкамі Оршы.

На-днях праведзен па крамах Оршы рэйд брыгад друку і «лёгкай кавалерыі». Выяўлены новыя злачынныя факты.

У краму № 11 ЦРК (заг. крамы Кізінсон) 3 жніўня паступіла рыба ў продаж без фактуры. Таму зранку яна прадавалася па 1 р. 50 к. кіло, а з 12 г. дня па 95 к.

У ларку № 14 арцелі «Комунар» хамут каштуе 20 руб., а цана напісана 34 р. 30 кап.

У краме № 24 Белдзяржгандля (загадчык Рашал) пад прылаўкам знойдзен спецфонд для знаёмых—два дзесяткі шаўковых пачох.

Пракуратура дагэтуль па ўсіх паказаных сігналах пінаватых не прыцягнула да суровай адказнасці.

А. МІКУЦКІ.

АЧЫСЦІЦЬ АД ЖУЛІКАЎ ВІЦЕБСКІЯ МАГАЗІНЫ

Пастанова ЦК ВКП(б) аб барацьбе з абважваннем, абмерваннем спажыўцоў і парушэннем раздробных цэн у гандлі знайшла шырокі водгук сярод працоўных Віцебшчыны.

У адпаведнасці пастановы ад 7 і 8 жніўня ў горадзе праведзены масавыя рэйды рабочых брыгад, рабкораў, лёгкай кавалерыі на прадпрыемствы работы раздробнай сеткі. Выяўлен рад агідных фактаў абкрадвання рабочых спажыўцоў.

Загадчык хлебнай базы ВЦРК Вальфсон, адпускаючы хлеб рабочым сталоўкам, сістэматычна абважваў іх на сотні кілаграмаў.

Прыкладу жуліка Вальфсона пачследвала загадчыца хлебнай крамы № 1 ЗРК акупярнай фабрыкі Гісіна. Яна ўхітрылася кожнага рабочага фабрыкі абважваць на 30-40 грамаў.

Работніца хлебнай крамы Белхарчгандля Малочнікава вынайшла свой спосаб абкрадвання рабочых спажыўцоў. Яна падкладала пад вагу паперу, розныя цяжкія рэчы і такім чынам недаважвала на кожнае кіло хлеба на некалькі дзесяткаў грамаў.

У часе праверкі крамы № 4 ВЦРК была злоўлена на месцы злачынства работніца прылаўка Дворкіна, недаважваючая спажыўцам хлеб. У 1800 грамах нехапала 15-25 грамаў.

Жулікі працвілі і ў магазіны Таргсіна.

У магазіне № 2 прадаўшчыца Плакуе пры продажы селядцоў і іншых прадуктаў абважвала кожнага пакупніка на 30-60 грам.

Загадчык магазіна ЦРК № 74 Гінзбург прадаваў гуркі па 1 руб. 5 кап. за кіло замест устаноўленай цэны 40 кап. Загадчык магазіна № 46 Белхарчгандля Карман прадаваў цукеркі «Касалапы мішка» па цане 48 руб. за кіло замест устаноўленай цаны 40 руб.

Рэйды выявілі, што ў большасці магазінаў ЦРК і ОРС'аў не кляймілася гіры. Старшыня ЦРК т. **Верба** на сходзе работнікаў прылаўка вымушан быў прызнацца, што 75 проц. гір і вагоў павінны былі быць забраны з сістэмы, як няправільныя.

Устае пытанне: па-першае, чаму да пастановы ЦК тав. Верба аб гэтым замоўчваў і, па-другое, чаму ведаючы аб агідным стане сваёй вагавай гаспадаркі, ён прадаў Белдзяржгандлю 50 новых праверанных вагаў.

Брыгада «Звязды»:

С. БУТОМАЎ, АРК. ЗАРУБЕЖНЫ, Н. КУМОК

РЭЧЫЦКІЯ „ЛЕВАКІ" НЕ УНІМАЮЦЦА

РАЙКОМ ПАРТЫІ І РАЙВЫКАНКОМ ПРЫТРЫМЛІВАЮЦЦА АПАРТУНІСТЫЧНАГА НЕЙТРАЛІТЭТА

20 чэрвеня «Звязда» змясціла пісьмо групы вучняў з Рэчыцкага раёна пра грубейшыя перагібы старшыні Гарвальскага сельсавета Буслова ў адносінах да працоўных аднаасобнікаў. Тады-ж наш карэспандэнт т. Палешчук выкрыў і другіх загібшчыкаў, з другога, Дзюрдзеёўскага сельсавета—Скаромнага, Плоткіна і іншых.

Метады работы Буслова, Скаромнага, Плоткіна—грубейшае адміністраванне, незаконнае із'яцце маемасці, арышты і другія дыскрэдытуючыя совецкую ўладу ўчынкі.

«Звязда» тады ў сваёй прыпісцы расцэньвала Буславых і К°, як агентаў кулака, іх дзеянні, як дзеянні нашых злейшых ворагаў.

З таго часу прайшло ўжо больш месяца, але рэчыцкія раённыя кіруючыя арганізацыі (райком і РВК), якіх мы тады законна папракалі ў гніла-ліберальных адносінах да «лявацкіх» дзеянняў Бусловых і яго паплечнікаў, да гэтага часу нават НЕ ПАЛІЧЫЛІ СВАІМ АБАВЯЗКАМ АБГАВАРЫЦЬ МАТЭРЫЯЛЫ ГАЗЕТЫ.

Пісьмо тав. Куземкіна і матэрыял нашага спецкора, якія мы сёння яшчэ раз змяшчаем, з усёй відавочнасцю паказваюць, ШТО РЭЧЫЦКІЯ «ЛЕВАКІ» НЕ УНІМАЮЦЦА, А ПРАДАЎЖАЮЦЬ ДЗЕЙНІЧАЦЬ, ЯК І РАНЕЙ. «Звязда» мае матэрыялы, з якіх відаць, што падобнага роду «лявацкая» работа мае месца не толькі ў Гарвальскім, але і ў Дзюрдзенскім, Ліскоўскім, Новабарсукоўскім і радзе іншых сельсветаў раёна.

НА ФОНЕ ГЭТЫХ АГІДНЕЙШЫХ ФАКТАЎ ЯШЧЭ З БОЛЬШАЙ ВЫРАЗНАСЦЮ АДЛЮСТРОЎВАЕЦЦА ТАЯ ШКОДНАЯ, АПАРТУНІСТЫЧНАЯ ПАЗІЦЫЯ РАЙКОМА ПАРТЫІ, ЯКУЮ ЁН ЗАНЯЎ у адносінах фактаў «лявацкіх» перагібаў, ускрытых «Звяздой». Паводзіны райкома і встатніх раённых арганізацый (РВК, пракурор) нельга інакш расцэньваць, ЯК ПРАМОЕ ПАПУШЧЭННЕ І САДЗЕЙНАСЦЬ «ЛЕВАКАМ» У ІХ КУЛАЦКАЙ РАБОЦЕ ПА ДЫСКРЭДЫТАЦЫІ У ВАЧАХ ПРАЦОЎНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАКОНАЎ І ОРГАНАЎ СОВЕЦКАЙ УЛАДЫ.

Гэтыя, працягваючыяся гніла-ліберальныя адносіны да «лявацкіх» перагібшчыкаў — рэзультат неразумення кіраўнікамі рэчыцкай парторганізацыі сутнасці крытыкі наогул і САМАКРЫТЫКІ ў асаблівасці, неразуменне таго, што «САМАКРЫТЫКА ПАВІННА БЫЦЬ АДНОЙ З СУР'ЁЗНЕЙШЫХ СІЛ, РУХАЮЧЫХ НАПЕРАД НАША РАЗВІЦЦЁ» (Сталін).

(ПІСЬМО АДНААСОБНІКА)

У першых чыслах чэрвеня гэтага года старшыня Чарняўскага сельсавета, Рэчыцкага раёна, тав. Кобец і ўчастковы міліцыянер прапанавалі мне на працягу двух гадзін ушесці 102 руб. штафу за невыкананне задання па працугужпавіннасці. Мая настойлівая просьба адтэрмінаваць спагнанне штрафу хоць на тры дні Кобецам не прынята пад увагу. У такі кароткі тэрмін столькі грошай я дастаць не мог. За гэта Кобец і інспектар міліцыі забралі ў мяне парасё вагою пуды чатыры і самавар.

Такія дзеянні сельсавета ў адносінах да мяне лічу няправільнымі. Даведзенага мне плана працугужпавіннасці я не выканаў па двум прычынам: па-першае, паведамленне аб гэтым атрымана мной толькі за два дні да накладання штрафу, **па-другое,** конь мой у гэты час знаходзіўся ў майго сына на адлегласці каля 50 кілометраў на рабоце па апрацоўцы яго зямлі. Дзеянні сельсавета лічу незаконнымі яшчэ і таму, што гаспадарка мая наогул не павінна атрымліваць задання па гужпрацпавіннасці, бо мне і маёй жонцы ўжо па 65 год, а дачцы толькі 17 год.

Скардзіўся я на дзеянні сельсавета райпракурору тав. Краснаслабодцаву. Паабяцаў разабрацца ў маёй скарзе, але вось ужо прайшло больш паўтара месяца і адказу пракурор мне не даў.

А. КУЗЁМКІН.

***

Факты, указаныя ў пісьме Кузёмкіна, пры расследванні вашым карэспандэнтам на месцы пацвердзіліся. 1 чэрвеня Кузёмкіну Аляксею ўручылі абвестку аб працугужпавіннасці, у якой было ўказана, што ён павінен адпрацаваць на дарожных работах на сваім кані 6 дзён з 24 па 30 мая.

У гэты-ж самы дзень старшыня сельсовета тав. Кобец прышоў да Кузёмкіна праверыць, як выконвае ён працугужпавіннасць. Кузёмкін заявіў старшыні сельсовета, што ён зараз выехаць на дарогу не можа, бо каня дома няма. І сапраўды каня дома не было, ён у гэты час знаходзіўся ў сына Кузёмкіна на пасёлку Добраволец, Гарвальскага сельсовета, па адлегласці каля 50 кілометраў.

Кузёмкін прасіў Кобеца адтэрмінаваць выезд на дарогу на некалькі дзён, пакуль ён не прывядзе каня ад сына. У гэтым яму Кобец адмовіў і прапанаваў у чымбы-та ні было выехаць на дарогу.

Увечар 1 чэрвеня на прэзідыуме сельсовета па інфармацыі Кобеца, Кузёмкіна кваліфікуюць як злоснага сабатажніка дарожнага будаўніцтва і пастанаўляюць аштрафаваць яго ў размеры 102 рублі. Пазаўтра Кобец, член сельсовета Зайцаў і інспектар міліцыі Царопак прышлі ў хату Кузёмкіна спагнаць штраф. Прадставілі яму 2-хгадзінны тэрмін для ўплаты штрафу. Грошы за гэтыя дзве гадзіны Кузёмкін, зразумела, не змог дастаць. Тады ў яго канфіскуюць маемасць: забіраюць свінню і самавар.

Кузёмкін абскардзіў гэта раённаму пракурору тав. Краснаслабодцаву. Чатыры разы ён прыходзіў да пракурора пытацца аб рэзультатах яго скаргі і ўсе разы атрымліваў адзін адказ: «Разбярэмся і вам паведамім».

5 чэрвеня пракурор прачытаў заяву Кузёмкіна і наклаўшы рэзалюцыю: «Пераглядзець на прэзідыуме РВК з мэтай адмянення незаконнага штрафу», паклаў заяву зноў у груды сваіх папер.

Такі лёс скарг не аднаго толькі Кузёмкіна. У папцы пракурора ляжыць больш сотні заяў і скарг.

Прывяду змест некалькіх заяў з пракурорскай папкі.

З Вышамірскага сельсовета. Заява гр-на Піпчыка Петра (пасёлак Ахвоцкі) аб тым, што ў яго сельсовет за невыкананне веснавой сяўбы забраў усю маемасць. РВК пастанову сельсовета скасаваў, таго часу прайшло тры месяцы, а забраную маемасць сельсовет яму неварочае.

Заява гр-на Склеменка Паўла, таго-ж сельсовета, аб тым, што яшчэ ў восень 1933 г. у яго забралі карову за невыкананне мясазагатовак. Карову здалі ў калгас, а мяса за яго калгас не здаў і зараз з яго спаганяюць мяса за 1933 год. Заява падана 20 чэрвеня і дагэтуль не разгледжана.

З Артыкоўскага сельсовета. Заява гр-на Галавача Піліпа Кузміна аб неправільнай канфіскацыі каровы. Сельсовет западозрываў яго сына ў зладзействе (сын з ім даўно не жыве). За гэта забіраюць карову ў бацькі. Суд апраўдвае сына і прапануе звярнуць Галавачу карову. Карова не вернута.

У Рэчыцкім раёне разгляд заяў і скарг працоўных лічаць лішняй абузай.

Пасля гэтага паўстае пытанне: ці зрабілі райком партыі (сакратар т. **Малінін**) і другія раённыя арганізацыі палітычныя і практычныя вывады з тых агідных кулацкіх спраў і «лявацкага» адміністравання ў паасобных сельсоветах, аб якіх пісала «Звязда» яшчэ 20 чэрвеня?

Большэвіцкіх вываў дагэтуль не зроблена. Райком і РВК нават не прызналі і нераскрытыкавалі сваіх памылак. Старшыня РВК т. Саўкоў, намеснік сакратара РК т. Святловіч, якія самі патуралі «лявацкім» дзеяннням старшыні Гарвальскага сельсовета т. Сычова, таксама не прыцягнуты да адказнасці.

Ці не з'яўляецца ўсё гэта адной з асноўных прычын і зусім нізкага процанта (35 проц.) калектывізацыі ў раёне? Нам здаецца, што так.

ПАЛЯШЧУК.

ПІСЬМЫ рабочых і калгаснікаў

НАЧАЛЬНІКУ ГАЛОЎНАГА КІРАЎНІЦТВА МІЛІЦЫІ тав. ФЛЕКСЕРУ.

БЮРАКРАТЫ З АРШАНСКАЙ РАЙМІЛІЦЫІ НЕ ЛІЧАЦЦА З ЧАСАМ РАБОЧЫХ

(ПІСЬМО ВАЕНКОМА)

У 200 рабочых і іх сем'яў 63 аршанскага, будаўнічага ўчастка пратэрмінаваліся пашпарты. Камендант інтэрната некалькі раз звяртаўся да начальніка пашпартнага стала аршанскай міліцыі з просьбай выехаць на ўчастак і зрабіць абмен пашпартоў. На гэта яму заўсёды адказвалі: «Гэта не наша справа».

Такой-жа думкі трымаецца і начальнік раймініцыі. На яго думку, кожны рабочы павінен сам прыйсці ў Оршу і атрымаць пашпарт.

Ім не важна тое, што ўчастак знаходзіцца на адлегласці 17 кілометраў ад Оршы, што хаджэнне ў Оршу дрэнна адаб'ецца на выкананні будаўнічай праграмы. Для іх важней за ўсё выкананне іх бюракратычных капрызаў.

РЭЗЭН.

СТАРШЫНІ ЧЭРЫКАЎСКАГА РВК ТАВ. РАТАЙКА.

ДЗЕ ПРЫЧЫНА ЦЯКУЧАСЦІ РАБОЧЫХ

(ПІСЬМО РАБОЧЫХ)

Не маюць сваёй сталоўкі рабочыя будаўніцтва маста праз раку Сож у Чэрыкаве. З-за гэтага яны прымушаны харчавацца ў сухамятку і пад адкрытым небам. Адгэтуль вялікая цякучасць рабочых.

РВК у свой час пастанавіў адвесці пад сталоўную памяшканне былога дваранина Стальмаховіча Б. Пастанова гэта да гэтага часу не выканана, бо Стальмаховіч не выбіраецца з кватэры, а РВК ніяк не здолее выселіць гэтага гаспадарчыка.

БЕРДЗІН, ГРАМЫКА, ЗАЙНОЎСКІ і іншыя (усяго 13 подпісаў).

СТАРШЫНІ ТАЛАЧЫНСКАГА РВК ТАВ. ФЕДАРЭНЧЫКУ.

КОРМЯЦЬ АБЯЦАННЯМІ

(ПІСЬМО АГРАНОМА)

Я ўжо трэці месяц не атрымліваю зарплаты. Не атрымліваюць і астатнія спецыялісты Талачынскага райсамаўзела.

На пытанне, калі выдадуць грошы, загадчык райфа заўсёды адказвае: «Няма грошай, атрымаеце праз некалькі дзён». А гэтыя «некалькі дзён» цягнуцца ўжо два месяцы.

Ведаюць аб гэтым райпрофсавет і райпракурор. Але і яны ніяк не рашаюцца ўздзейнічаць на кіраўнікоў райза.

І. Д. ФЕДАРЭНЧЫК.

МАГІЛЕЎСКІ РАЙКОМ КП(б)Б АБ МАТЭРЫЯЛАХ „ЗВЯЗДЫ"

Бюро магілеўскага РК КП(б)Б вынесла спецыяльную пастанову аб артыкулах «Звязды» ад 14 і 15 ліпеня пад загалоўкамі «Аб разбуральнай пільнасці ў Магілеўскім раёне» і «Разбазарваюць калгасную зямлю». Бюро ПРЫЗНАЛА ЎСЕ ФАКТЫ, УКАЗАНЫЯ Ў ГЭТЫХ АРТЫКУЛАХ ПРАВІЛЬНЫМІ, ПОУНАСЦЮ ПАЦВЕРДЗІЎШЫМІСЯ.

Працяжная кулацкая работа ў калгасе імя Сталіна (Мастоцкі сельсавет) — адзначыла бюро,—магла мець месца толькі ў выніку страты большэвіцкай пільнасці і зрошчвання з класава-чужымі элементамі былога старшыні сельсавета КАТОВА, у выніку адсутнасці канкрэтнага кіраўніцтва калгасамі з боку райземаддзела. Кіраўнік райземаддзела тав. МІХЕЕУ, не гледзячы на рад сігналаў друку аб становішчы ў калгасе імя Сталіна і на спецыяльную пастанову бюро РК КП(б)Б аб скажэннях палітыкі партыі ў надзяленні прысядзібнымі ўчасткамі, не прыняў ніякіх мер.

Інструктар РК КП(б)Б тав. РОДЗІН, будучы доўгі час у Мастоцкім сельсавеце, не заўважыў там усіх агіднасцей. Гэта сведчыць аб тым, што «САМАКРЫТЫКА ПАВІННА БЫЦЬ АДНОЙ З СУР'ЁЗНЕЙШЫХ СІЛ, РУХАЮЧЫХ НАПЕРАД НАША РАЗВІЦЦЁ» (Сталін).

Бюро РК пастанавіла старшыню калгаса імя Сталіна КАЗЛОВА МІРОНА З РАБОТЫ НЕАДКЛАДНА ЗНЯЦЬ; праўленне калгаса за патуранне кулацтву—распусціць. За сувязь з кулацкімі элементамі, растрату і п'янства былога старшыні сельсавета КАТОВА ВЫКЛЮЧЫЦЬ З РАДОЎ КП(б)Б.

Бюро РК намеціла рад мерапрыемстваў па аздаравленню Мастоцкага сельсавета, асабліва калгаса імя Сталіна.

Бюро абавязала пам. пракурора тав. Мярчука ў трохдзённы тэрмін скончыць следства па справе аб здзіванні калгасніка Пухлякова і перадаць гэту справу суду для разгляду ў паскораным парадку на месцы.

Бюро РК КП(б)Б прапанавала нізавым партарганізацыям пропрацаваць на сходах матэрыялы «Звязды» і пастанову райкома.

КЛАСАВЫ ВОРАГ У КРУПКАХ УЗНЯЎ ГАЛАВУ

Змяшчаемы сёння матэрыял аб тым, што ў Крупскім раёне класавы вораг узняў галаву, не з'яўляецца выпадковым.

«Звязда» пісала аб тым, што класавая слепата сакратара парткома м. Крупкі БАРДЗІЛОЎСКАГА і інструктара парткома ЛІСАВАЙ дала магчымасць кулаку Сухачэўскаму здзекавацца з калгасніцы Аўгіні Доўгай, каб пазбавіцца ад тых, якія перашкаджаюць кулацкім спробам развяліць калгас. «Звязда» пісала і аб тым, што гняздо злачынцаў разбурае соўгас Крупкі, што класава - варожыя элементы развальваюць калгас «Чырвоная змена».

Гэтых сігналаў было дастаткова райкому партыі для мабілізацыі партыйнай арганізацыі на ачыстку калгасаў раёна ад класава-варожых элементаў. Але гэтага чамусці не заўважыў райком партыі, доўшы магчымасць і сёння кулакам Салтыковым і ім падобным разбураць калгасы, распальваць нацыянальную варожасць.

Ліберальныя адносіны райкома партыі і райкома комсамола да шавіністычных і антысеміцкіх выпадзен Данільчыка, Смародзіна і іншых даюць магчымасць класава-варожым элементам адкрыта выступаць супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі.

«Звязда» пытае крупскі РК КП(б)Б, ці мае ён намер разгарнуць большэвіцкую работу па ажыццяўленню нацыянальнай палітыкі партыі і ачысткі калгасаў ад класава-варожых элементаў; ці мае ён намер разгарнуць большэвіцкую самакрытыку і выправіць свае грубыя палітычныя памылкі?

Кулакі, антысеміты, шавіністы ўсіх колераў у апошні час у Крупскім раёне ўзнялі галаву.

Амаль у адзін і той-жа час у адным канцы раёна, у в. **Асінаўка,** загадчык райканторы Заготжывёлы, комуніст **Данільчык** забараніў калгаснікам-літоўцам гаварыць у яго прысутнасці на літоўскай мове, прытразіўшы ў сукраціўным выпадку пусціць у ход стрэльбу, а ў другім канцы раёна, у в. **Смародзінка,** на комсамольскім сходзе выступіў комсамолец **КАВАЛЁЎ** з заявай, што «ўсе яўрэі трусы і даверыць ім зброю нельга».

Райком партыі вынес **ДАНІЛЬЧЫКУ** суровую вымову з папярэджаннем і прапанаваў усім парторгам распрацаваць на пыракіх сходах працоўных рашэнні студзеньскага абз'яднанага пленума ЦК і ЦКК па нацыянальнаму пытанню. І толькі. Пастанова бюро райкома на мясцах не выканана.

Райком комсамола толькі праз 25 дзён пасля вылазкі Кавалёва зацвердзіў пастанову комсамольскай групы аб выключэнні антысеміта з комсамола і прыняў агульную пастанову аб тым, што «антысеміты не месца ў комсамоле». Пытанне аб вылазках **КАВАЛЁВА і ДАНІЛЬЧЫКА** не ўзнята на прынцыповую палітычную вышыню.

Аб барацьбе раённых арганізацый з астаткамі контррэволюцыйнага нацдэмакратызма і шовінізма гаворыць хоць-бы такі факт: комуніст **ШАЛАК**—былы старшыня калгаса «Май», Шэйскага сельсавета, у п'яным вытлядзе звязаў двух работнікаў—украінцаў **ЦАРЭНКА і НАЗАРЭНКА** і з крыкам «бі хахлоў» збіў **ЦАРЭНКА** да непрытомнасці. **ШАЛАК** быў за гэта выключан з партыі і асуджан яшчэ 5 ліпеня, вынятай сесіяй нарсуда, на два гады пазбаўлення волі. Але гэты кулацкі агент і пасёнешні дзень з калгаса не выключан і прадаўжае працаваць на пасадзе старшынькі калгаса. Цяпер у калгасе кулакам і антысемітам (калгас засмечан) раздолле.

Некалькі дзён таму назад у гэтым-жа калгасе кулаком **ПАЦЭЕВЫМ МІХАСЕМ** (які меў да ўступлення ў калгас 15 гектараў зямлі, тры капі, тры каровы і трымаў пастаянна батрака) у адносінах да калгасніцы яўрэйкі **ЗІЛЬБЕРМАН** дапушчана контррэволюцыйная антысеміцкая выхадка. **ЗІЛЬБЕРМАН** прапанавала Пацэеву вынаць карову з калгаснага агарода. У адказ на гэта разлюшаны кулак накінуўся на яўрэйку з крыкам: «А твая якая справа, жыдоўка пархатая». **ЗІЛЬБЕРМАН** падала заяву ў праўленне калгаса. Заява папала к таму-ж **ШАЛАКУ** і засталася, відома, без рэагавання.

У гэтым-жа калгасе старшым конюхам працуе былы кулак **ДРАБКОЎ РЫГОР.** Гэты **ДРАБКОЎ** не так даўно яшчэ меў 20 гектараў зямлі і карыстаўся наёмнай працай. Толькі ў апошні час **ДРАБКОЎ** вывеў са строю двух лепшых коней калгаса.

Замест аддання пад суд праўленне прэпраравала гэтага «ўкраінца» грамі.

У калгасе «Звязда» (Уканцкі сельсавет) старшыня калгаса комсамолка **БУЛАЙ АЎГІННЯ** заявіла: «рукі не бяруцца за работу, бо ўлада ў нас жыдоўская». Па загаду гэтай-жа **БУЛАЙ АЎГІННІ** калгас зжаў 0.30 га зусім зялёнага жыта.

У калгасе імя Горкага, (Шэйскі сельсавет) арудуе шайка кулакоў, якою верхаводзяць браты **САЛТЫКАВЫ СЯРГЕЙ і АНДРЭЙ,** якія ў свой час былі выключаны з калгаса за шкодніцтва, а цяпер зноў прыняты. Гэтыя людзі імкнуцца выжыць з калгаса «не сваіх» людзей. Беднякоў пераселенцу, а зараз лепшаму ўдарніку калгаса **ТРУСУ** яны заяўляюць: «Убірайся, валацуга, тут табе не месца». Калгаснику актывісту, дамабілізаванаму чырвонаармейцу **МУРУНСОЎСКАМУ** яны адкрыта пагражаюць расправай за выкрыц ё іх кулацкіх спраў. «Убірайся, моў, совецкі сабака, а то хацей не збярэш».

Партыйныя арганізацыі слаба змагаюцца за ачыстку калгасаў ад класава-варожых элементаў. Ускрытыя вышэй рэдакцыяй «Звязды» факты шавіністычнай і антысеміцкай работы агентаў класавага ворага для Крупскага райкома КП(б)Б і КСМ не паслужылі сігналам.

ГЕРЦОВІЧ, ЛЯВОНЕНКА, ЕРМАКОВІЧ, ГУРЭВІЧ, ЮЛЕСАЎ

ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА ЖЫВОГА ЧАЛАВЕКА

„Палітаддзельская звязда"—орган палітаддзела Боркавіцкай МТС

З пачатку 1934 г. процант калектывізацыі ў Дрысенскім раёне не толькі не павялічыўся, але нават знізіўся з 60 да 57,8. Гэта зніжэнне закранула і зону дзейнасці Боркавіцкай МТС.

Друк, і ў першую чаргу палітаддзельскі, штодзённа і штогадзінна ўмацоўвае нашы сувязі з масамі, умела спалучаючы барацьбу за агульныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва з клопатамі і ўважлівымі адносінамі да кожнага асобнага працоўнага.

«Палітаддзельская звязда» з'яўляецца, на жаль, выключэннем. Яна мае вушы, якія дрэнна ўлаўліваюць настроі той ці іншай групы працоўных, яна мае вочы, якія не бачаць нават такія факты, як зніжэнне процанту калектывізацыі.

У Дрысенскім раёне ўжо ў 1934 г. некалькі дзесяткаў дваароў выйшлі з калгасаў. Аб іх у спісах сельсветаў значыцца каротка і... няясна: «З калгаса вышаў добраахвотна».

Ці ўзяла газета хоць аднаго гэтых жывых людзей, ці прышла да іх на дом, ці паглядзела, што хаваецца за гэтымі словамі «добраахвотна вышаў», ці паставіла потым гэты факт на ўвесь рост у друку, каб абгаварыць разам з масамі іншых калгаснікаў — няўжо нельга было знайсьці гэтыя прычыны, якія прымусілі чалавека звярнуцца зноў да аднаасобнага жыцця?

Ускрыць гэтыя прычыны, знішчыць гэтыя прычыны, выхаваць на гэтай справе масы — гэта была-б вялікая і ганаровая задача. Але «Палітаддзельская звязда», як і раённая газета, не займаецца такімі «дробязямі». Што ім дзесятак-другі працоўных, калі яны іх абслугоўваюць тысячы і любяць лічыць «на тысячы».

У Дрысенскім раёне выключаныя з калгасаў, налічваюцца сотнямі, і зараз многія з гэтых выключаных скардзяцца па ўсіх інстанцыях на няправільнае выключэнне. Ці можа быць у газеты стопроцантная ўпэўненасць, што сярод гэтых скарг няма грунтоўных? Узяць, вывучыць хоць-бы некалькі такіх скарг, ускрыць аднаго-двух «лявацкіх» перагібшчыкаў у гэтай справе і паставіць пытанне аб іх прыцягненні да адказнасці, — вялікая і ганаровая задача газеты. Але газета гэтага не робіць. Чаму? Таму, што «Палітаддзельская звязда» сама мае, мякка кажучы, лёгкаважны падыход да пытання аб выключэннях з калгасаў. Гэта няцяжка ўбачыць нават пры беглым аглядзе газеты.

«Кулацкага падпявалу вон з калгаса!» — ускрыквае «Палітаддзельская звязда» ў нумары ад 21 чэрвеня. У чым-жа справа? Аказваецца:

> **«Дадзека Міхась у калгасе «Кліч Леніна», Прудзінкоўскага сельсавета, вядзе разлагацельную работу. Ён падгаварвае калгаснікаў, каб яны не выконвалі норм і дабіваліся, каб нормы знізілі. Гэты-ж Дадзека ў час веснавой сяўбы нормы нікопі не выконваў».**

Ітак, Дадзека Міхась не выконвае норм і выказваецца супроць іх, а таму, на думку газеты, «кулацкага падпявалу» трэба неадкладна гнаць з калгаса. Мы пытаем «Палітаддзельскую звязду», што стала-б назаўтра ў нас з калектывізацыяй, калі-б сёння мы, следуючы яе рэцэпту, выключылі з калгасаў усіх, якія не выконваюць норм, сумняваюцца ў іх мэтазгоднасці і нараканць з поваду ўдарнай працы ў калгасах. Ці не прышлося-б нам у нашых маладых калгасах указаць на дзверы добрай трэці ўчарайшых аднаасобнікаў, якія хоць і пераступілі рысу аднаасобнага жыцця і цягнуцца за перадавымі калгаснікамі, але ўсё яшчэ хістаюцца, бяруць пад сумненне калгасныя парадкі і часам бузяць? Ці можам мы агульна адносіць іх у разрад «кулацкіх падпявал» і прымяняць да іх у якасці адзінай «меры выхавання» выключэнне з калгаса?

Можа Дадзека сапраўды кулацкі падпявала, а можа ён і кулак, які ўкрыўся ў калгасе і які не па несвядомасці, а з поўнай свядомасцю выступае супроць норм.

Але тады газета павінна была-б інакш падыйсці да гэтай справы. Тады трэба было іменна пачаць з таго, што Дадзека — класавы вораг і паказаць, што ён дзейнічае свядома.

Заметка-ж у такім выглядзе, як яна падана, па-першае, не выклікае спачування мас, па-другое, няправільна арыентуе калгасных кіраўнікоў, вельмі многія з якіх і без таго схільны памяняць адміністраваннем масавую работу.

Выпадак з Дадзека не адзіны У нумары 12 газета заяўляе: «Сабатажніку Бурлакову не месца ў калгасе». У заметцы паведамляецца, што «пад уплывам кулацка-варожай часткі» Бурлакоў і яго сын 10 дзён не выходзяць на работу. Хто такі сам Бурлакоў і пад уплывам якіх канкрэтна кулацкіх асоб ён не выходзіць на работу—гэта газета замоўчвае. Відаць, яна сама гэтым проста не пацікавілася. А між тым, заклікаючы калгас прымяніць да калгасніка «вышэйшую меру пакарання» — выключэнне з калгаса, — яна павінна была перш за ўсё пацікавіцца, хто такая гэта «кулацкая частка», пад уплывам якой Бурлакоў не выходзіць на работу і хто сам Бурлакоў. У адносінах першых газета павінна была, безумоўна, прымяніць свае патрабаванні, а ў адносінах апошняга паглядзець, ці не падасца ён мерам выхавачага парадку. У такім выглядзе, як заметка падана, ствараецца ўражанне, што на «ўплыў кулацкай часткі» тут указваецца толькі па «тэорыі магчымасці», а ў адносінах Бурлакова рэдакцыі самой невядома, чаму ён не выходзіць на работу. А можа тут якая-небудзь уважлівая прычына? Усё гэта газету мала цікавіць. «Выгнаць з калгаса», «прыцягнуць да адказу», «жорстка пакараць» — вось сродкі, рэкамендуемыя газетай у адносінах правіннічышыхся калгаснікаў.

«Палітаддзельская звязда» яўна не любіць займацца крапатлівай работай па выхаванню калгасніка старанна растлумачваць яму палітыку партыі ў справе калгаснага руху.

Вось чаму зніжэнне процанта калектывізацыі ў Дрысенскім раёне не выклікала з яе боку ні малейшай увагі.

У кароткі тэрмін свайго існавання палітаддзельскі друк ператварыўся ў зброю выключнай сілы па ўмацаванню сувязей з масамі. Поспехі палітаддзельскага друку абумовіла перш за ўсё яе непарыўная сувязь з **жывымі людзьмі,** блізкае знаёмства з іх **работай і жыццём.**

Гэта трэба зразумець «Палітаддзельскай звяздзе» і, зразумеўшы, павярнуцца тварам да жывога чалавека.

Агляд друку

За рубяжом

„ПІСЬМО З КРАІНЫ ГОЛАДУ“

ПАРЫЖ, 7 жніўня. (Інфармац. «Правды»). Пад гэтым загалоўкам Страсбургская «Юманіта» публікуе пісьмо рабочых з Вайнденбурга — Нейродзе (Сілезія) аб жыцці германскіх шахцёраў.

У пісьме ўказваецца, што з часу прыходу фашысцкай дыктатуры шахцёрам «стала лічэ галадней жыць. Зарплата скарочана, а хлеб і бульба даражэюць. Зноў зволена 1.800 рабочых».

«Нядаўна,—гаворыцца ў пісьме, — да нас з'явіўся кіраўнік «рабочага фронта» Лей. Каб вітаць яго, прышлося выйсці на работу не ў 6 гадзін раніцы, як звычайна, а ў 2 гадзіны ночы. У 10 гадзін нас вывелі на вуліцу. У 11 гадзін ён павінен быў прыбыць. Адміністрацыя прымусіла нас выстраіцца шпалерамі. Узмоцненыя атрады штурмавікоў і членаў ахоўных атрадаў нікаму не давалі ўходзіць. Лей з'явіўся толькі к гадзіне, стаў перад строем гарнякоў і запытаў, як нам жывецца. Замест адказу яму працягнулі зчар сцвелы хлеб, паказаны маргарынам. А потым на кінофільме было паказана, быццам нашы рабочыя яго вітаюць».

Пісьмо заканчваецца ўказаннем, што абурэнне фашысцкім прыгнётам і палітыкай голаду расце сярод гарнякоў і што камуністы больш чым калі-небудзь карыстаюцца сярод іх уплывам.

СОВЕЦКІЯ ЛЁТЧЫКІ Ў РЫМЕ І ПАРЫЖЫ

У АВІЯЦЫЙНА-НАВУКОВЫМ ЦЭНТРЫ ІТАЛІІ

РЫМ, 8 жніўня. (БЕЛТА). Совецкія госці ў суправаджэнні генерала Парс наведалі авіяцыйны навукова - эксперыментальны цэнтр у Мантэчэліё (недалёка ад Рыма), дзе яны былі прыняты з воінскімі пачаннямі гапаровай вартай і генералам Ферары. Совецкім лётчыкам былі прадэманстраваны апошнія навукова-тэхнічныя дасягненні італьянскай авіяцыі, а таксама былі прадстаўлены сусветны рэкардыст на вышыню палёту Данаці і вядомы лётчык Бернардзі, прадэманстраваўшы ў паветры мастацтва вышэйшага пілатажа пад апладысменты совецкіх гасцей. Пакідаючы Мантэчэліё, совецкія авіятары выказалі начальствуючым асобам цёплую падзяку за аказаны радушны прыём і азнаямленне з цікавейшай работай буйнага растучага навукова-эксперыментальнага цэнтра.

ГУТАРКА З НАЧАЛЬНІКАМ ГЕНШТАБА ФРАНЦУЗСКАЙ АРМІІ

ПАРЫЖ, 8 жніўня. (БЕЛТА). Сёння раніцой начальнік Галоўнага ўпраўлення грамадзянскага паветранага флота СССР т. Уншліхт і начальнік штаба ваенна-паветраных сіл РСЧА т. Хрыпін у суправаджэнні совецкіх аташэ Венцова і Засільчэнко наведалі начальніка генеральнага штаба французскай арміі Гамелена і яго намеснікаў генералаў Кольсон і Лувзо.

У ФРАНЦУЗСКАГА МІНІСТРА АВІЯЦЫІ

ПАРЫЖ, 8 жніўня. (БЕЛТА). Учора совецкія лётчыкі зрабілі першыя візіты кіраўнікам французскай авіяцыі. Начальнік Галоўнага ўпраўлення грамадзянскага паветранага флота СССР тав. Уншліхт і начальнік штаба ваенна-паветраных сіл РСЧА тав. Хрыпін наведалі французскага міністра авіяцыі Дэнэна. Гутарка паміж імі, якая працягвалася 40 мінут, кранулася як пытанняў праграмы прабывання совецкіх лётчыкаў у Францыі, так і пытанняў развіцця авіяцыі. Гутарка насіла сардэчны характар.

ЗАКЛЮЧНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ МІЖНАРОДНАГА ЖАНОЧАГА КАНГРЭСА

ПАРЫЖ, 8 жніўня. (БЕЛТА). Учарашняе заключнае пасяджэнне міжнароднага жаночага кангрэса барацьбы супроць фашызма і імперыялістычнай вайны ажыццявіла выступленнем совецкай дэлегаткі Комавай — удзельніцы экспедыцыі «Челюскіна», якая была сустрэтая апладысментамі. Выступленне Комавай, у прыватнасці яе расказ аб ролі жанчын у эпапеі «Челюскіна», неаднаразова перарывалася апладысментамі.

Выступаўшая потым работніца, прыбыўшая на кангрэс з нацыянал-сацыялістскай Германіі, расказала аб барацьбе германскіх работніц за вызваленне Тэльмана. Французская дэлегатка — селянка Нормэн—расказала аб цяжкім становішчы працоўнага селянства і батракоў у краінах капіталу і супроцьставіла іх становішча жыццю калгаснікаў у СССР.

Совецкая дэлегатка з Башкірыі т. Шымергаліна паведаміла кангрэсу аб эканамічным і нацыянальным вызваленні башкірскіх жанчын і іх жыцця ў калгасе. «З рабынь мы ператварыліся у свядомых будаўніц соцыялізма», заявіла яна. Яе прамова была выслухана кангрэсам з вялікай увагай.

Аўстрыйскія дэлегаткі — удовы ўдзельнікаў лютаўскіх падзей у Аўстрыі—заклікалі да барацьбы супроць аўстрыйскага фашызма.

Совецкая дэлегатка—прафесар Медзведзева—паведаміла кангрэсу аб удзеле жанчын у навуковай рабоце ў Совецкім Саюзе.

Спрэчкі закончыліся выступленнем іспанскай дэлегаткі, якая расказала аб жорсткай эксплаатацыі работніц у Іспаніі.

Пасяджэнне скончылася прыняццем праграмы патрабаванняў, выпрацаванай на нарадзе розных дэлегацый, а таксама прыняццем адозвы да жанчын усіх краін з заклікам да барацьбы супроць вайны і фашызма.

КРЫВАВЫЯ ПАДЗЕІ Ў АЛЖЫРЫ

ПАРЫЖ, 8 жніўня. (БЕЛТА). Атрыманы падробязныя весткі з Алжыра аб крывавых сутычках у Канстанціне (Алжыр, Афрыка) паміж арабамі і яўрэямі. Забіта 40 чалавек, у тым ліку некалькі дзяцей і ранена 200 чалавек. Разгромлена шмат сотні магазінаў. Падпален рад будынкаў. Падзярпелі галоўным чынам яўрэі. «Юманіта» апублікавала зварот Цэнтральнага Камітэта компартыі Францыі, у якім ён заклікае [illegible] нацый да яднання і прадасцерагае супроць правакацый, маючых мэтай раздробніць сілы рабочага класа.

ЛІТВА ПРЫМЕ УДЗЕЛ У РАСПРАЦОЎЦЫ УСХОДНЯГА ПАКТА

ЗАЯВА ЛАЗАРАЙЦІСА

КАУНАС, 8 жніўня. (БЕЛТА). Літоўскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе:

«У гутарцы з прадстаўнікамі друку міністр замежных спраў Лазарайціс падкрэсліў сардэчны прыём, зроблены яму ў Маскве і цёплась перагавораў, якія адбываліся ў Маскве з Літвінавым і другімі членамі совецкага ўрада.

Лазарайціс адзначыў, што ва ўсіх пытаннях міжнароднай палітыкі паміж абодвума ўрадамі выявілася поўнае супадзенне погляду. Цэнтральным пытаннем перагавораў,—заявіў Лазарайціс,—з'яўляецца праект Усходняга пакта, заключэнне якога будзе садзейнічаць паляпшэнню атмасферы во Усходняй Еўропе. Відавочна,—указаў Лазарайціс,—што гэты пакт не зможа быць выкарыстан для таго, каб санкцыянаваць парушэнне праў якой-небудзь краіны. Літва,—заявіў Лазарайціс,—прыме безумоўна ўдзел у перагаворах па распрацоўцы тэкста Усходняга пакта.

У заключэнні Лазарайціс падкрэсліў, што Совецка-літоўскія адносіны яшчэ больш умацаваліся і што Літва, з'яўляючыся сапраўдным прыхільнікам Лігі нацый, гатова супрацоўнічаць з усімі дзяржавамі, маючымі тую-ж самую мэту.

ПАЎСТАННІ У МАНЧЖУРЫІ

ШАНХАЙ, 8 жніўня. (БЕЛТА). Кітайскія газеты паведамляюць, што 5 жніўня каля 500 паўстанцаў зрабілі налёт на горад Мукдэн, маючы намер вызваліць кіраўніка паўстанцкага руху ў Манчжурыі Цян Цянь-мея, арыштаванага і зняволенага ў турму японцамі. На вуліцах Мукдэна разгрывалася жорсткая сутычка паміж паўстанцамі і японо-манчжурскімі войскамі, якая працягвалася 2 гадзіны. Японцы пусцілі ў ход кулямёты і лёгкую артылерыю.

У Мукдэне абʼяўлена ваеннае становішча.

Як паведамляе «Шуньбао», паўстанцы, уваходзячыя ў атрад Цян Цянь-мея, рыхтуюць напад на Дахушань (буйны пункт на Мукдэн-шанхайгуаньскай чыгунцы).

Паводле манчжурскай афіцыяльнай інфармацыі, улады мукдэнскай правінцыі за апошнія 3 месяцы арыштавалі звыш 9 тысяч кітайцаў, западазроных ва ўдзеле ў паўстанцкім руху. Па гатай-жа інфармацыі, у баях з паўстанцамі японскія войскі страцілі 66 чалавек забітымі.

ЗГОДА ДАДЗЕНА

РАШЭННЕ АЎСТРЫЙСКАГА ЎРАДА

ВЕНА, 8 жніўня. (БЕЛТА). Аўстрыйскі ўрад учора вынес рашэнне даць сваю згоду на назначэнне фон-Папена надзвычайным паслом і паўнамоцным міністрам Германіі ў Вене.

Характэрны каментарый «Рэйхспост», які аўстрыйскі друк разглядае, як «афіцыёзны» да гэтай пастановы». Газета піша:

«Нават у цяжкіх выпадках у міжнародных дыпламатычных адносінах не прынята адмаўляць у згодзе на назначэнне дыпламатаў. Згаджаючыся на назначэнне фон-Папена, Аўстрыя будзе чакаць, у якой меры місія новага пасла будзе адпавядаць выказанаму пры назначэнні фон-Папена жаданню ўміратварыць аўстра-германскія адносіны».

НА РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ З АБВАЖВАННЕМ І АБМЕРВАННЕМ

ГУТАРКА З НАМ. ПРАКУРОРА СССР тав. А. Я. ВЫШЫНСКІМ

У гутарцы з нашым супрацоўнікам намеснік пракурора СССР тав. А. Я. Вышынскі адзначыў, што пастанова ЦК ВКП(б) аб барацьбе з абважваннем і абмерваннем спажыўцоў і парушэннем раздробных цэн у гандлі накіравана супроць аднаго з небяспечных злачынстваў, звязаных з ашукваннем працоўных, дзяржавы і замахам на штарэсы шырачэзных працоўных мас.

Барацьба за далейшае павышэнне ўзроўню матэрыяльнага і культурнага добрабыту мас самым цесным чынам звязана з барацьбой супроць усякіх жульніцкіх махінацый класавага ворага і яго агентуры, пралезшых у апарат нашай гандлюючай і каператыўнай сеткі.

Кожная капейка, украдзеная ў рабочага спажыўца і працоўнага шляхам абважвання, абмервання і таму падобнага жульніцтва, асабліва ў сучасных умовах, набывае вастрэйшы характар.

Бязлітасны ўдар па жуліках, махінатарах з'яўляецца свяшчэнным абавязкам органаў пракуратуры і суда, пастаўленых на варце пролетарскай дыктатуры, соцыялістычнага будаўніцтва і добрабыту шырокіх мас рабочых і сялян.

НА УСЕБЕЛАРУСКІМ З'ЕЗДЗЕ РАБОТНІКАЎ ЮСТЫЦЫІ

САПРАЎДНАЙ ПЕРАБУДОВЫ ЯШЧЭ НЯМА

Учора на раніцішнім пасяджэнні з'езда былі заслуханы даклады старшыні Вярхоўнага суда тав. Кудзельскага і начальніка папраўча-працоўных лагераў тав. Пінхуса, пасля чаго разгарнуліся спрэчкі.

Тав. Бярковіч (Талачын), Кодзік (Барысаў), Каган (Полацк) і іншыя адзначылі, што пракуратура не праяўляе яшчэ неабходнай гібкасці і аператыўнасці для барацьбы з раскрадвальнікамі дзяржаўнай маёмасці.

Не гледзячы на доўгі тэрмін, які прайшоў з часу XVII партыйнага з'езда, пракуратура БССР і Вярхоўны суд яшчэ не перабудавалі сваёй работы. Уся перабудова фактычна звялася да таго, што замест тэрытарыяльных кіраўніцтваў пры пракуратуры рэспублікі створаны пракуроры па галінах.

Выступаўшыя таварышы адзначылі, што з боку асобных раённых партыйных арганізацый праяўляецца лібералізм да злосных парушальнікаў раволюцыйнай законнасці. Есць выпадкі, калі сакратар РК і старшыня РВК (Лёзна) бяруць над сваю абарону раскрадвальнікаў дзяржаўнай маёмасці.

У спрэчках было адзначана і тое, што становішча следчага яшчэ неакрэсленае. У большасці следчыя знаходзяцца пры раённай пракуратуры і райвыканкоме ў якасці агентаў па дэручэннях.

На з'ездзе выступіў намеснік старшыні суда Маскоўскай вобласці тав. Назараў, які падзяліўся вопытам работы суда Маскоўскай вобласці і адзначыў асноўныя недахопы ў рабоце Вярхоўнага суда БССР.

***

Вячэрняе пасяджэнне было прысвечана пераважна выступленню намесніка старшыні Вярхоўнага суда СССР тав. Вінаградава і выступленню намесніка пракурора рэспублікі СССР тав. Вышынскага.

З вялікай зацікаўленасцю і ўвагай былі выслуханы надзвычайна цікавыя практычныя, палітычна-завостраныя даклады гэтых таварышоў.

СУД НАД СТАРАДАРОЖСКІМІ ЧУБАРАЎЦАМІ

Новае, заможнае калгаснае жыццё ўпарта завалёўвае свае пазіцыі на калгасным дваро. У вёску Нова-Фалічы, Стара-Дарожскага раёна, яно прышло новай сямігадзовай школай, шматлікай колькасцю радыёкропак, дзесяткамі экземпляраў газет і кніжак. Але старое ўпарта змагаецца з новым.

На пытанне старшыні выязной сесіі Вярхоўнага суда, як праўленне калгаса «Герой працы» планавала святкаваць 1 мая, старшыня калгаса—падсудны Лапанік Антон—адказаў:

— Узялі з калгаснай касы 350 руб., закупілі гарэлку, зарэзалі калгаснае цяля і адсвяткавалі.

— І нічым іншым, апрача п'янства, вы дзень 1 мая адзначыць не маглі?—пытае падсудных старшыня суда.

— А як-жа! Так заўсёды ў нас святы адзначаліся.

Так падсудныя, якія сталі на чале свайго калгаса, стараліся перакосіць гарэлку, мордабойства, пажары, якімі звычайна заканчваліся рэлігійныя святы, на нашы пролетарскія святы.

Абараняць гэтыя «святы» ўстоі—вось на што выступілі Лапанікі, распаліўшы нацыянальную варожасць у сваім калгасе, закрыўшы аднаасобнікам дзверы ў калгас, тэрарызаваўшы ўсіх тых, хто адмовіўся выконваць іх кулацкую волю.

— Які прадукт калектывізацыі вашай вёскі,—пытае падсудных Лапаніка Антона—старшыню калгаса—прадстаўнік дзяржаўнага абвінавачання тав. Мінкін.

— Не ведаю,—адказвае падсудны.—Не было калі гэтым займацца.

Між іншым, увесь Нова-Дарожскі сельсавет, у які ўваходзіць і вёска Нова-Фалічы, калектывізаваў толькі на 19 проц. Дзяржаўнае і грамадзкае абвінавачанне падрабязна цікавіліся прычынамі такога нізкага процанта калектывізацыі.

З допыту сведак па справе высветлілася, што з 45 сем'яў, якія ўваходзяць у калгас «Герой працы», амаль усе з'яўляюцца сваякамі.

— Чужых у калгас не бралі,—вось установка Лапанікаў Фёдара, Паўла, Васіля і іншых.

Чужымі звалі ўсіх, прышоўшых у калгас не з вёскі Нова-Фалічы. Рухаўцы, Барысавы, Смольскія і іншыя лічыліся чужымі. І сведка Барысава Ганна на пытанне пракурора, чаму звалцілі іменна Р., так і адказала суду:

— Звалцілі яе, каб так, выжыўшы з калгаса сям'ю Р., пасля за нас, астатніх, узяцца.

Толькі пасля яе выступлення суду стала ясна, чаму і як пачалі гвалціць Р. Лапанік Фёдар раней пабег клікаць у хлеў калгасніка Барысава, а пасля пабег за мужам звалчанай Р. І ў першым, і ў другім выпадку арганізатары і натхняльнікі чубараўшчыны хацелі выжыць аднаго і другога з калгаса, каб пасля мець магчымасць сказаць, што і Барысаў удзельнічаў у злачынстве. А калі жонка Барысава хацела затрымаць мужа, каб той у хлеў не ходзіў, Лапанік Фёдар на яе накінуўся і збіў.

Так бяралі Лапанікі калгас ад «чужых», каб эпрача «сваіх» у калгасе не было, каб ніхто не выкрываў іх злачынствы ў пакрамы насення, у знішчэнні калгаснага насення, у масавым падпалы парасят на ферме ў выніку безгаспадарчасці і надбайства.

Гэта крутая парука ўсіх падсудных выклікала асаблівае абурэнне пераполненай увесь час залы, калі першы фізічны гвалтаўнік Яновіч спрабаваў выступаць ад імя ўсіх падсудных, заяўляючы: «Мы ліквідаваны», «мы патрабуем» і т. д. Ужо з самага пачатку адчувалася арганізаванасць усёй гэтай шайкі антысавецкіх элементаў, насаджаных на лаву падсудных.

1, безумоўна, меў рацыю пракурор, калі ён на першым пасяджэнні звярнуў на гэты факт увагу суда, убачыўшы ў гэтым лішні доказ, што, пачынаючы ад моманту антысавецкіх цкаванняў і канчаючы згвалтаваннем калгасніцы Р., усё ў іх было разлічана, дакладна абдумана і арганізавана. Толькі таму, што ў калгасе амаль усе былі звязаны сваяцтвам, гэта антысавецкая дзейнасць падсудных не была выяўлена раней.

Вельмі характэрна адказаў Лапанік Антон грамадзкаму абвінаваўцу на пытанне аб крытыцы і самакрытыцы ў калгасе.

— Не, гэтага ў нас не было. Каго крытыкаваць?..

І сапраўды—не будзе-ж Лапанік Павал або Сцяпан крытыкаваць Лапаніка Фёдара. Ну, а што датычыць Рухаўцовых, Барысавых, Смольскіх і іншых, дык іх як-небудзь удасца супакоіць. І нікімі ородкамі для дасягнення гэтых мэт не пагарджалі. Для таго, каб выжыць Смольскіх з калгаса, Лапанік Антон крытыкаваць Лапаніка Фёдара. Ну, а што датычыць Рухаўцовых, Барысавых, Смольскіх і іншых, дык іх як-небудзь удасца супакоіць. І нікімі ородкамі для дасягнення гэтых мэт не пагарджалі. Для таго, каб выжыць Смольскіх з калгаса, Лапанік Антон пасудныя у адносінах да аднаасобнікаў. Кожны дзень Лапанік Антон штрафаваў то аднаго, то другога аднаасобніка на 15-20 руб. Ламаведама ў чыю карысць, тэрарызуючы іх крыкам і гвалтам.

Гэты бок справы асабліва падкрэсліў грамадзкі абвінаваўца ў сваім выступленні. Паўторны суд-сваім выступленні. Паўторны суд-вы разгляд справы стара-дарожскіх чубараўцаў адбыўся галоўным чынам таму, што пры першым разглядзе суд галоўную ўвагу звярнуў на факт згвалтавання калгасніцы Р., не ўлічыўшы ўсіх акалічнасцей, выклікам якіх гэта згвалтаванне з'явілася.

У гэтай справе надзвычай выразна выявілася хітрая тактыка класавага ворага, які, авалодаўшыя ў калгасах, імкнецца спрабаваць далейшую калектывізацыю, выкарыстоўваючы для гэтага усякія метады і сродкі.

Каб выгнаць з калгаса сям'ю Р., яны арганізавалі згвалтаванне.

Каб выгнаць сям'ю Смольскіх, яны напісалі зацедамы хлуслівую карэспандэнцыю, падпісаўшы яе прозвішчамі неіснуючых вучняў.

Так хлусівай, тэрорам і гвалтам класавы зораг спрабуе шалёнае супраціўленне новаму паду, перашкаджае абʼяднанню ўсяго працоўнага селянства ў калгасы для забяспечэння заможнага жыцця для ўсіх калгаснікаў.

Б.

***

Выязная сесія Вярхоўнага суда прыгаварыла арганізатараў і натхняльнікаў распальвання нацыянальнай варожасці і згвалтавання калгасніцы Р.—Лапаніка Антона, Лапаніка Фёдара і Рагавенка—да 8 год зняволення, а ўдзельнікаў згвалтавання Яновіча і Шчэрбу да 6 год зняволення.

ЗАРЫСОЎКА В. ВОЛКАВА

РАГАВЕНКА

ЗАРЫСОЎКА В. ВОЛКАВА

ЛАПАНІК АНТОН

ЗАРЫСОЎКА В. ВОЛКАВА

ЛАПАНІК ФЁДАР

ПАПРАЎКІ

У пастанове Наркамзема БССР аб барацьбе з хваробай бульбы—фітафторай, якая змешчана ва ўчарашнім нумары газеты, па віне стылярэдактуры ў сказоным выпадзе паданы пункт 1 і раздзел «а» гэтага пункта пастановы, якія трэба чытаць так:

«1. Абавязаць начальнікаў райза, дырэктароў МТС і соўгасаў, старшынь праўленняў калгасаў арганізаваць абавязковае скошванне бульбоўніка:

а) на раннім сартах (ранняя рожа, эпікур), якія моцна пакрыты фітафторай—неадкладна».

***

У зводцы аб ходзе соцыялістычнага наміху паміж БССР і Заходняй вобласцю, таксама змешчанай ва ўчарашнім нумары, выпрацільна паказан процант выканання хлебапастаўках. Хлебапастаўкі выкананы на 12,9 проц.

Адказ. рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

Рэдакцыя газ. «ЗВЯЗДА» склікае сёння, 10 жніўня ў 7 гадзін вечара

НАРАДУ

РАБОТНІКАЎ МЕНСКАГА ЧЫГУНАЧНАГА ВУЗЛА І КЛІЕНТУРЫ

ПА ПЫТАННЮ

аб гатоўнасці да прыёмкі зярна.

На нараду выклікаюцца:

АД МЕНСКАГА ЧЫГУНАЧНАГА ВУЗЛА—Фралоў, Кімдан, Корзун, Бачышча, Шэрман і Голуб.

АД БЕЛЗАГОТЗЯРНА—Шпак і Багалешы.

АД ГАРАДСКОЙ КАНТОРЫ ЗАГОТЗЯРНО—Кондрусін, Эйгэ і Ханвлес.

Нарада адбудзецца ў памяшканні рэдакцыі (Совецкая, 63 з наверх, транспартны аддзел.

ДЗЯРЖЦЫРК

ПРЫБЫЛІ І ВЫСТУПАЮЦЬ

трупа Сярэдняй Азіі 10 КАДЫР-ГУЛЯМ 10

Відомае дрэсіроўшчыня папугаяў НЕДЗІН,

Дрэсіроўшчыца верблюдаў Гукі ХАНУМ, і цэлы шэраг новых нумароў.

ПАЧАТАК у 9 гадзін вечара.

12 і 13 жніўня у 2 гадз. дня РАНІШНІКІ пры ўдзеле новых артыстаў і па зменшаных цэнах.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Ад 10 жніўня

НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ КАМЕДЫЯ

КАХАННЕ АЛЁНЫ

Рэж. Б. ЮРЦАЎ.

У гал. ролях: Г. СЕРГЕЕВА, Л. АРЛОВА, К. ТУРНЯК, В. ЧУБЕЛЁЎ

НА ЛЕТНІЙ ЭСТРАДЗЕ КАНЦЭРТЫ Грыгорый КРАСАВІН гумар—сатыра

2 МІХАЙЛОЎСКІЯ—стралкі

2 ДЖЫГІТЫ—каўказкія пляскі.

Штодзённа 4 сеансы. Пачатак у 6, 7—30, 9—15 і 11 г. Каса ад 1 гадз.

Кіно „Дзіцячы пампеяны“ Мастацкі фільм Жанчына з ярмаркі

Кіно СПАРТАК Выдатны мастацкі фільм АПОШНІ АТРАКЦЫЁН драма ў 6 частках

Саюзны жывёлагадоўчы племянны трэст у г. Менску БЕЛПЛЕМТРЭСТ ЛІКВІДУЕЦЦА

Усім арганізацыям, якія маюць тым ці іншым прэтэнзіі да трэста, прадаўжаць гэтакіх паперы 20 жніўня г.г.

Прэтэнзіі, якія будуць паступаць пасля казанага часу, разглядацца не будуць.

Ліквідком.

Завочны сектар Беларускага дзяржаўнага універсітэта

аб'яўляе АСЕННІ НАБОР

студэнтаў на 1934-35 навучальны год на яўрэйскае завочнае фізіка-матэматычнае аддзяленне.

Тэрмін падачы заяў да 15 верасня 1934 г.

Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: Менск, Універсітэцкі гарадок, прыродазнаўчы корпус, пакой № 104, завочны сектар.

Рэктар ВДУ ДЗЬЯК/Ў.

ПАМЯШКАННЕ БЕЛДЗЯРЖТЭАТРА БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

СЁННЯ, 10 ЖНІЎНЯ

ПІКАВАЯ ДАМА

опера ў 3-х актах і 7 малюнках, муз. П. І. ЧАЙКОЎСКАГА.

Мастацкі кіраўнік засл. арт. респ. Гітберг І. А.

Пачатак у 8 гадз. 30 мін. веч.

Білеты ў касе тэатра і ў раб. касе.

РАМОНТНА-МЕХАНІЧНЫЯ МАЙСТЭРНІ МЕНГОРСОВЕТА

прымаюць і выконваюць наступныя работы:

рэстаўрацыю і рамонт пішучых машын і арыфмометраў усіх сістэм (выклік механікаў па тэлеф. 22-302, адрас: Пляц Волі, 4)

рамонт і рэстаўрацыю веласіпедаў, рамонт прымусаў,

заказы на бляшаныя вырабы, таксама на нікеліраванні работы (адрас: Козьма-Дзямянаўская, 10, тэл. 23-036);

рамонт с.-г. машын і машыннага абсталявання, розныя слясарныя і такарныя работы і заказы на медна-ліцейныя работы (адрас: Няміга, 37, тэл. 22-137).

ДЭЗІНФЕКЦЫЙНАМУ БЮРО пры ЦК „Чырвонага Крыжа“ патрэбны: планавік і чорнарабочыя на сталую работу.

Звярачацца па адрасу: вул. Карла Маркса, 3—Дзяжбюро.

ДА ЎВАГІ ПАРТЫЙНАГА, КОМСАМОЛЬСКАГА, ПРАФЕСІЯНАЛЬНАГА І КАЛГАСНАГА АКТЫВА.

Беларускі інстытут масавага завочнага навучання партактыва пры ЦК КП(б)Б

аб'яўляе НАБОР ЗАВОЧНІКАЎ

у 1) завочны Комвуз, 2) завочную соўпартшколу, 3) 6-месячныя курсы актыва калгасаў, соўгасаў і МТС, 4) на вывучэнне асобных соцыяльна-эканамічных дысцыплін (гісторыя партыі, палітэканоміі, ленінізм, дыямат, усеагульная гісторыя, гісторыя Комінтэрна, асобныя творы класікаў марксізма-ленінізма).

Завочны комвуз

У завочны комвуз прымаюцца раённы, гарадскі і цэнтральны партыйна-камсамольскі, прафсаюзны і калгасны актыў, які мае палітычную падрыхтоўку ў аб'ёме вячэрняй соўпартшколы і агульна-адукацыйную ў аб'ёме пяці класаў сярэдняй школы.

Завочнікі комвуза вывучаюць на год на ўзроўні комвуза два з паступных трох прадметаў: гісторыю партыі, палітэканомію і ленінізм.

Скончыўшым завочны комвуз прадстаўляецца права пераважнага паступлення ў трохгадовую ВКСГШ і на курсы марксізма-ленінізма.

Радыёлекцыі

Завочнікі комвуза на працягу навучальнага года слухаюць у аб'ёмавым парадку радыёлекцыі інстытута: па ленінізму—12 лекцый (лютый—май), па эканомпалітыцы—12 лекцый (лістапад—люты).

Завочная партыйная школа

У 8-месячную партыйную школу прымаюцца члены партыі, комсамольцы і беспартыйны актыў рабочых і калгаснікаў, скончыўшыя пачатковую школу ленінізма і маюць чыгн веды ў аб'ёме чатырох класаў сярэдняй школы.

Завочнікі партыйнай школы вывучаюць гісторыю партыі (па пад ручніку Е. Ярасла́ўскага), палітэканомію (па падручніку Леонцьева), рашэнні XVII партз'езда і пытанні бягучай палітыкі партыі і ўрада.

Пасляхова скончыўшым завочную партыйную школу даюцца права пераважнага паступлення ў двухгадовую ВКСГШ.

Радыёлекцыі

Завочнікі 8-месячнай партыйнай школы слухаюць на працягу кастрычніка-студзеня радыёлекцыі інстытута па гісторыі ВКП(б) (усяго 18 лекцый) і цыкл радыёлекцый па пытаннях палітыкі партыі ў вёсцы.

6-месячныя курсы актыва калгасаў, соўгасаў і МТС

Завочныя курсы даюць актыву калгасаў, соўгасаў і МТС палітычную падрыхтоўку ў аб'ёме пачатковай школы, знаёмяць з асноўнымі пытаннямі бягучай палітыкі партыі, агратэхніці і павышаюць веды па роднай мове.

На курсы прымаюцца члены партыі, комсамольцы і беспартыйны актыў калгасаў, соўгасаў і МТС. Ад паступаючых патрабуецца ўменне бегла чытаць і пісаць і рабіць прасцейшыя запісы прачытанага.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць права пераважнага паступлення ў двухгадовую ВКСГШ.

Радыёлекцыі

Завочнікі калгасных курсаў на працягу навучальнага года слухаюць 6 радыёлекцый інстытута па органі зацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ў калгасах і 8 лекцый па выбару па пытаннях агратэхніці або жывёлагадоўлі (ў залежнасці ад вытворчага напрамку данага калгаса).

Вывучэнне соцыяльна-эканамічных дысцыплін

Вывучэнне асобных соцыяльна-эканамічных дысцыплін арганізуецца для партыйна-камсамольскага актыву, які хочуць вывучаць адзін прадмет, што ўваходзіць або не ўваходзіць у навучальны план комвуза.

Тэрмін навучання па кожнаму прадмету разлічан ад 6 месяцаў да года, у залежнасці ад умення самастойна працаваць і часу, адведзенага вучобе.

На вывучэнне асобных сацыяльна-эканамічных дысцыплін прымаюцца раённы партыйна-камсамольскі актыў, а таксама выкладчыкі грамадзкіх дысцыплін сярэдняй школы, аграномы, лекары і іншыя нарэна-тэхнічныя работнікі.

Ад паступаючых на вывучэнне асобных дысцыплін патрабуецца ці літычная падрыхтоўка ў аб'ёме пачарняй соўпартшколы і агульнаадукацыйная ў аб'ёме не ніжэй 5-ці класаў сярэдняй школы.

Выкладанне вядзецца на беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай мовах.

Для лепшай арганізацыі завочнай і радыёпартыйнубы, арганізаванага абслугоўвання выкладчыкамі, набор завочнікаў у Комвуз, соўпартшколу і курсы актыва калгасаў, соўгасаў на 1934-35 навучальны год праводзіцца толькі ў 26 апорных раёнах: Менскім, Віцебскім, Гомельскім, Хойніцкім, Тураўскім, Рэчыцкім, Клімавіцкім, Магілёўскім, Рагачоўскім, Касцюковіцкім, Мсціслаўскім, Мозырскім, Заслаўскім, Дзяржынскім, Быхаўскім, Барэзінскім, Жыткавіцкім, Полацкім, Ушачскім, Бабруйскім, Ісіпавіцкім, Лельчыцкім, Багушэвскім і Камарынскім.

Для паступлення на завочную партыйную школу трэба падаць анкету з рэкамендацыяй партыйнай арганізацыі.

Бланкі анкет можна атрымаць у райкоме КП(б)Б. Тады-ж трэба падаць анкеты і атрымаць усе спраўкі па завочнай партучобе.

Анкеты прымаюцца да 1-га кастрычніка 1934 года.

Па гэтых-жа справах можна звяртацца ў Беларускі інстытут масавага завочнага навучання партактыва пры ЦК КП(б)Б (БМЗО): гор. Менск, пер. вул. К. Маркса і Энгельса, д. № 47-30.

Загадчык Культпропам ЦК КП(б)Б ПАСЮКЕВІЧ.

Дырэктар ІМЗО пры ЦК КП(б)Б БАРАН.

Выпускаючы — А. КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэратыпар — Е. КАГАН, ст. друкар З. РУБІН.

Менск, друкарня «Звязды».

Уп. Галаўлітбіта № К—3178.